105 гадоў

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

9 ЖНІЎНЯ 2022 г. АЎТОРАК № 154 (29776)

# ЗАЎСЁДЫ З НАРОДАМ

***Калектыву рэдакцыі газеты «Звязда»***
***Рэдакцыйна-выдавецкай установы***
***«Выдавецкі дом «Звязда»***

*Шаноўныя сябры!*

*Віншую вас са 105-годдзем выхаду ў свет першага нумара газеты «Звязда».*

*Выданне распачало сваю дзейнасць у вірлівую, рэвалюцыйную эпоху, калі з'явіўся гістарычны шанц зрабіць явай адвечную ідэю самавызначэння беларусаў. З той пары газета, з якой супрацоўнічаюць самыя вядомыя беларускія пісьменнікі і паэты, заўсёды з народам — і ў чорныя дні нямецкай акупацыі, і ў гады мірнага будаўніцтва.*

*Падчас Вялікай Айчыннай вайны «Звязда», выпускам якой у падполлі, рызыкуючы жыццём, займаліся мінскія патрыёты, змагалася з ворагам вострым праўдзівым словам. Потым былі Перамога і ўпартая праца беларусаў па аднаўленні роднай зямлі. Артыкулы і фотаздымкі пра тыя падзеі — частка гераічнага народнага летапісу.*

*У нашы дні супрацоўнікі Выдавецкага дома «Звязда» таксама ўносяць значны ўклад у захаванне беларускай мовы, гісторыі і культуры, садзейнічаюць зберажэнню традыцый і высокіх маральных каштоўнасцяў у грамадстве. Упэўнены, вы і надалей будзеце штодзённа і настойліва рабіць гэту пачэсную, патрыятычную справу дзеля будучыні краіны.*

*Жадаю ўсім моцнага здароўя, дабрабыту, мірнага неба, натхнення і новых прафесійных дасягненняў.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Ганна ЛЕШЧАНКА — даўняя і актыўная падпісчыца «Звязды». Жыве ў вёсцы Замосце Слуцкага раёна, цяпер на пенсіі, амаль сорак гадоў сябруе са «Звяздою». Не толькі сама чытае, але і сваіх унукаў, а іх у Ганны Палікарпаўны пяцёра, далучае да роднай мовы. Унукі Ілья і Стэфанія *(яны на гэтым здымку)* жывуць у Мінску, але кожнае лета прыязджаюць да бабулі ў вёску і першыя атрымліваюць з рук паштальёна свежы нумар.

— Карысная газета, стараюся прачытваць з першай да апошняй старонкі, падабаюцца многія матэрыялы, а некаторыя нават выразаю, захоўваю, — кажа Ганна Палікарпаўна. — Раней я выпісвала розныя выданні, потым спынілася на «Звяздзе».

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

## «ТОЛЬКІ ТЫЯ ВЫЙДУЦЬ З КРЫЗІСУ БОЛЬШ МОЦНЫМІ, ХТО БУДЗЕ БЕГЧЫ. ПОЙДЗЕМ ПЕШШУ — НАС ДАГОНЯЦЬ І РАЗДУШАЦЬ, ЗАТОПЧУЦЬ»



Фота БелТА.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка наведаў завод па вытворчасці металічнага ліста і белай бляхі ТАА «ММПЗ-груп» у Мёрах. Прыбыўшы на прадпрыемства, Аляксандр Лукашэнка адразу перайшоў да справы. Прэзідэнт азнаёміўся з выстаўкай прадукцыі завода, пацікавіўся аб'ёмамі вытворчасці і наяўнасцю сыравіннай базы.**

Кіраўніку дзяржавы было далажана, што магутнасці прадпрыемства разлічаны на вытворчасць да 150 тысяч тон белай бляхі ў год. Гэтая прадукцыя запатрабаваная як на ўнутраным, так і на знешніх рынках. Віцэ-прэм'ер Юрый Назараў растлумачыў: перавага завода ў тым, што тут выпрабляюць самую тонкую белую бляху на постсавецкай прасторы. Яна выкарыстоўваецца ў харчовай, парфумернай, нафтахімічнай прадукцыі. У Беларусі аб'ём рынку — каля 30—35 тысяч тон.

«Мы пераканаліся, што ўсё гэта трэба. І тое, што мы пачалі рабіць, вельмі патрэбна. Гэта імпартазамяшчэнне і як мінімум 35 тысяч тон мы можам спажываць унутры Беларусі», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Аднак Прэзідэнт падкрэсліў, што прадпрыемства павінна абслугоўваць 100 працэнтаў беларускага рынку. «Цяпер шанц. Сёння мы свабодныя. Хлопцы (маецца на ўвазе Захад. — **«Зв.»**), вы супраць нас драконаўскія меры? Да сустрэчы! Мы павінны выбудаваць, заняць свой рынак», — сказаў ён.

Таксама кіраўнік дзяржавы даручыў на працягу тыдня прызначыць дырэктара на Мёрскі металапракатны завод. «Ідэальнае прадпрыемства ператварылі ў банкрута. У нас прадпрыемстваў такіх няма. Гэта суперпрадпрыемства. Тут проста трэба закасаць рукавы і выпрабляць прадукцыю, збываць», — падкрэсліў ён. Як адзначыў намеснік прэм'ер-міністра Юрый Назараў, па першапачатковых планах прадпрыемства ўжо даўно павінна было выйсці на праектную магутнасць. Але гэтыя планы былі правалены. Цяпер урад разлічвае, што напоўніцу завод пачне працаваць у 2024 годзе.

«Каб на працягу тыдня тут быў завод з дырэктарам. Ніякага банкруцтва, ніякага антыкрызіснага кіраўніка. Будзе дырэктар — ён будзе займацца крызісам. Трэба спыніць усю гэту балбатню», — запатрабаваў Прэзідэнт.

### «Вы працуеце як прадпрыемства беларускае»

У графіку рабочай паездкі кіраўніка дзяржавы была і размова з работнікамі прадпрыемства. «Самы галоўны вынік майго наведвання: мы ўжо дамовіліся аб двух Героях Беларусі, якія выканаюць даручанае ім і атрымаюць зоркі героя. Гэты завод павінен нараджаць новых герояў для Беларусі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Але хто менавіта атрымае такое высокае званне, кіраўнік дзяржавы не ўдакладніў.

СТАР. 2

## КОРАТКА

- **Міністэрства аховы здароўя дазволіла прышчэпліваць ад каранавіруса дзяцей з пяці гадоў.**
- Астанкі 108 воінаў Чырвонай Арміі перапахавалі ў Віцебскім раёне.
- **У Гомельскай вобласці адрамантавана амаль 60 працэнтаў дарог ад гадавога плана.**
- Сумы маёмасных падаткаў можна даведацца ў асабістым кабінеце на сайце МПЗ.
- **БЧ пачала пастаўляць грузы паскоранымі цягнікамі з Беларусі ў Азербайджан.**

ISSN 1990 — 763X

22154

9 771990 763008

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый ПІНЕВІЧ, міністр аховы здароўя:**

*«Воспа малпаў не нясе сур'ёзнай эпідэмічнай небяспекі для беларусаў — у краіне практычна адсутнічаюць перадумовы для актыўнага распаўсюджвання гэтага захворвання. У нас няма груп рызыкі, якія прывялі да ўсплёску воспы малпаў у іншых дзяржавах. Хвалепадобнасць падачы інфармацыі з розных крыніц, у тым ліку навуковых, навукова-папулярных і палітычных, уплывае на тое, як мяняецца стаўленне да захворвання. Як і ў выпадку з пандэміяй. Яна вельмі цяжкая з пункту гледжання медыцынскага аспекту. У той жа час вакол пандэміі было нямала пытанняў у плане ўспрымання яе людзьмі. Аб гэтым гаварыў, у тым ліку, кіраўнік нашай дзяржавы. Наконт воспы малпаў можна не хвалявацца».*

# «ТОЛЬКІ ТЫЯ ВЫЙДУЦЬ З КРЫЗІСУ БОЛЬШ МОЦНЫМІ, ХТО БУДЗЕ БЕГЧЫ. ПОЙДЗЕМ ПЕШШУ — НАС ДАГОНЯЦЬ І РАЗДУШАЦЬ, ЗАТОПЧУЦЬ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што, калі прымалася рашэнне аб будаўніцтве ў Мёрах новага завода з прыцягненнем прыватнага інвестара, дзяржава падтрымала гэты праект, бо такое прадпрыемства паспрыяла б развіццю раёна. Але ўласнікі свае абяцанні не выканалі, сарваўшы тэрміны ўвядзення вытворчасці ў эксплуатацыю і пачаўшы звальняць людзей. Больш за тое, яны аказаліся нячыстымі на руку. У сітуацыю ўмяшалася дзяржава, завод выйшаў з прастою і пачаў працаваць. «Ваш кіраўнік з сённяшняга дня — паўнапраўны дырэктар. Ніякіх банкруцтваў, ніякіх вытворчасцяў — там чорт ведае што панавыдумвалі. З сёння вы працуеце як прадпрыемства беларускае, дзяржаўнае», — заявіў Прэзідэнт. Ён таксама адзначыў, што ўсе даўгі прадпрыемства дзяржава бярэ на сябе. Па словах кіраўніка дзяржавы, ніякай цяганіны, ніякага банкруцтва больш быць не павінна.

Прэзідэнт заўважыў, што ранейшыя ўладальнікі завода яшчэ на стадыі будаўніцтва скралі ў прадпрыемства шмат грошай. Раней паведамлялася, што інвестар уклаў у прадпрыемства каля 400 млн еўра. Для гэтага банкі выдалі беспрэцэдэнтныя крэдыты. «Завод гэты столькі каштаваць не можа. Гэта мы бачым у першым набліжэнні. Значыць, тыя, хто абяцаў пабудаваць гэты завод, узялі крэдыты ў банках, замовілі, прывезлі абсталяванне, пабудавалі завод. Дорага. Дзе грошы? Гэта галоўнае пытанне да тых, хто сёння знаходзіцца ў следчым ізалятары», — адзначыў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, усе, хто праходзіць па крымінальнай справе, павінны кампенсаваць нанесеную дзяржаве і людзям шкоду.

«У крыўду мы нікога з вас не дадзім. Таму вы можаце спакойна працаваць. Завод будзе працаваць менавіта так, як мы некалі думалі. Вось мэта майго прыезду. Я хачу, каб вы працавалі, таму што вы — гэта ўвесь Мёрскі край. Калі ваш завод будзе працаваць, гэта пацягне ўвесь край уверх», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

## Попыт на прадукцыю вялікі

Падчас размовы з калектывам Прэзідэнт адказаў на пытанне аб шляхах пераадолення эканамічных санкцый. Па яго словах, ва ўмовах санкцыйнага ціску важна ведаць стан спраў на прадпрыемствах, удзяляць увагу кожнаму, своечасова вырашаць праблемы. «Мы павінны прайсці кожнае прадпрыемства і паглядзець, чаго яму не хапае. Вось я і прыехаў паглядзець, чаго вам не хапае. Добрая пуга — вось што трэба. Можа, не столькі для вас, колькі для асобных, хто тут знаходзіцца. Я ведаю, што вы з задавальненнем будзеце працаваць. Вы асвоілі гэту складаную тэхніку, гатовы рабіць тонкі ліст, які робяць адзінкі прадпрыемстваў у свеце. Заказы ёсць. Вы гатовыя працаваць, але цяганіна... Узнікла праблема — яе трэба вырашаць, вырашаць імгненна», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што попыт на айчынную прадукцыю цяпер вялікі, прычым гэта датычыцца ўсёй лінейкі сельскагаспадарчай тэхнікі і камплектуючых да яе. «З Расіі немцы, амерыканцы пайшлі, якія купілі там заводы, — у нас адкрыўся рынак. Міністр прамысловасці дакладвае: мы не паспяваем для Растсельмаша ў Расіі камплектуючыя, якія яны просяць нас, зрабіць на Гомсельмашы. Попыт на нашу прадукцыю вялікі. Гэта час магчымасцяў, і толькі тыя выйдуць з крызісу больш моцнымі, хто будзе бегчы. Пойдзем пешшу — нас дагоняць і раздушаць, затопчуць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка выказаўся аб паводзінах палітыкаў, якія знаходзяцца ў кіраўніцтве Польшчы. «Паглядзіце ў Польшчы. Самая агрэсіўная ў адносінах да нас дзяржава. Не разумею — навошта? У нас жывуць этнічныя палякі, нармальныя людзі. Нядрэнна працуюць. Адзінкі ёсць ачмурэлыя, дык у нас і беларусаў такіх хапае. Нармальна можна жыць і працаваць. Чаго ім не хапае? Рэйтынг іх лідараў ужо ніжэйшы за 30 %. Яны селі на амерыканскую кабылу і скачуць па Еўропе. Немцы іх ненавідзяць ужо вакол, але церпяць. Чаму? Таму што амерыканцы іх падтрымліваюць. Яны ўжо гатовы частку Украіны хапануць, Беларусь яны цалкам гатовы праглынуць. Не атрымаецца», — заявіў Прэзідэнт.

Паводле слоў беларускага лідара, нягледзячы на рыторыку і паводзіны некаторых палітыкаў, якія ўводзяць санкцыі, бізнес шукае шляхі ўзаемадзеяння. «Калі ім трэба вось гэтае «золата», якое вы робіце (маецца на ўвазе прадукцыя ММПЗ), акольнымі шляхамі, як заўгодна, праз Афрыку, Азію, але мы яго прададзім, гэты тавар. І прададём», — сказаў ён. На думку кіраўніка дзяржавы, цяжкасці з пастаўкай сыравіны таксама вырашальныя.

## Малады завод для моладзі

Прэзідэнт перакананы, што ў цяперашніх умовах у Мёрскага завода ёсць усё неабходнае для эфектыўнай работы. Адзначаецца невялікі дэфіцыт кваліфікаваных спецыялістаў, чалавек 60—80. Аднак Аляксандр Лукашэнка прапанаваў вырашыць гэтае пытанне праз прыцягненне студэнтаў апошніх курсаў ВНУ і іх фінальнае навучанне на месцы. «Жыллё ёсць. Трэба — падтрымаем. Але гэта завод самы сучасны, яго нельга загубіць. Гэта малады завод для моладзі. Беражыце гэта прадпрыемства, для вас няма і не будзе ніякіх праблем, таму што прадукцыя, якую вы робіце, патрэбна ва ўсім свеце», — адзначыў беларускі лідар.

Адказваючы на пытанні працоўнага калектыву, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што існуе па шляху стварэння буйных вытворчасцяў у невялікіх гарадах, як гэта было, напрыклад, у Мёрах, немэтазгодна, бо туды сыходзіць шмат кадраў і ў выніку ў сельскай гаспадарцы не хапае работнікаў. «Вы, як пыласос, з вёскі выцягнулі вялізную колькасць працоўных рук. А нам трэба і людзей карміць, Віцебшчына павінна сябе забяспечваць. Нам трэба, каб людзі на палях працавалі. А ў палях не хапае людзей. Таму гэта не той шлях, па якім мы пойдзем і будзем у маленькіх гарадах або паблізу гэтых гарадоў будаваць такія вытворчасці», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Самы аптымальны варыянт, па словах Прэзідэнта, — арганізацыя ў кожным раёне невялікай вытворчасці максімум на 60 працоўных месцаў. Адпаведныя даручэнні па стварэнні такіх аб'ектаў былі даведзены кіраўнікам райвыканкамаў. Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што дзяржава будзе займацца будаўніцтвам сацыяльных аб'ектаў. «Вы павінны самі зарабляць і будаваць разам з прадпрыемствам. Мы будзем падтрымліваць вашае прадпрыемства, каб будавалі арэндназ жыллё, каб гэтае жыллё належала вашаму заводу. Прыйшоў на завод — атрымлівай кватэру, сышоў — да сустрэчы. А куды дзявацца?» — сказаў Прэзідэнт. Ён таксама звярнуў увагу на асабістую ініцыятыву мясцовага насельніцтва і іх адказнасць за развіццё рэгіёна, дзе яны жывуць: «Ведайце, што гэта ваша месца, для вас і вашых дзяцей, дзе вы будзеце жыць і працаваць».

## Каб людзі на месцы зараблялі больш

Падчас размовы з калектывам Мёрскага металапракатнага завода кіраўнік дзяржавы адказаў на пытанне наконт падатку на збор ягад і грыбоў. «Адкуль у вас гэта? Пакуль я Прэзідэнт — які падатак на грыбы і ягады?! Як мы возьмем з чалавека падатак, як палічым ягады і грыбы? Гэта дзікасць, дурнота поўная. Ніколі гэтага не было і быць не можа», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што людзі могуць спакойна, не турбуючыся аб якіх-небудзь падатках, збіраць грыбы, ягады і прадаваць іх, нарыхтоўваць. Гэта датычыцца і жыхароў прыграніных рэгіёнаў, грамадзян іншых дзяржаў, якім таксама дазволена збіраць дзікарослыя расліны ў беларускіх лясах. «Чаму я сваім людзям павінен забараніць збіраць ягады і грыбы і прадаваць? Гэта глупства поўнае! Ды больш вы збірайце грыбоў, ягад і гандлюйце. Я, наадварот, прыхільнік таго, каб людзі на месцы зараблялі больш», — сказаў ён.

Прэзідэнт нагадаў, што ў свой час па ініцыятыве санітарна-эпідэміялагічных службаў была спроба забараніць людзям прадаваць узоўж дарог прадукцыю з уласнага падвор'я, у тым ліку і сабраныя ў лесе грыбы і ягады. Матывавана гэта было клопатам аб бяспецы грамадзян. Аднак кіраўнік дзяржавы запярэчыў, што людзі самі адказныя за сваё здароўе і могуць разабрацца, дзе і што ім купляць, таму лічыць патрэбным дазваляць такі гандаль.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

---

Грамадзянская супольнасць

# Урокі падзеі двухгадовай даўніны ўжо асэнсаваны

## Сёння ў Мінску праходзіць форум патрыятычных сіл

**У Купалаўскім тэатры зноў аншлаг. Сёння тут праходзіць форум патрыятычных сіл, які сабраў прадстаўнікоў асноўных грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый краіны. Ініцыятарам выступіла рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Белая Русь».**

«Мы праводзім гэты форум ва ўзаемадзеянні з іншымі канструктыўнымі грамадскімі сіламі нашай краіны. Яго асноўная задача, перш за ўсё, заключаецца ў тым, каб яшчэ раз зверыць гадзіннікі наконт тых задач, якія стаяць перад грамадскімі аб'яднаннямі на сучасным этапе, абмеркаваць значныя для грамадзянскай супольнасці пытанні. У прыватнасці, гэта прасоўванне грамадзянскіх ініцыятыў, больш поўнае ўзаемадзеянне дзяржавы і грамадзянскай супольнасці. Трэба сказаць, што гэты форум будзе сімвалізаваць сабой пачатак святкавання Дня народнага адзінства, які адзначаецца 17 верасня», — расказаў **старшыня РГА «Белая Русь» Алег РАМАНАЎ.**

Кіраўнік грамадскага аб'яднання таксама падкрэсліў, што дата правядзення форуму — 9 жніўня — абрана невыпадкова. Па яго словах, месца і дата сімвалічныя. «Два гады пасля прэзідэнцкіх выбараў і няўдалага дзяржперавароту ў нашай краіне. Вядома, урокі падзей двухгадовай даўніны ўжо асэнсаваны. Дата і месца выбраны невыпадкова. Купалаўскі тэатр — адзін з цэнтраў беларускай культуры. Месца, з якім звязана шмат падзей у нашай гісторыі. І месца, якое, на жаль, хацелі зрабіць адным з цэнтраў пратэсту. Але беларускі народ, беларуская дзяржава гэтага не дапусцілі. І сёння Купалаўскі тэатр па-ранейшаму з'яўляецца значным цэнтрам культуры нашай краіны», — растлумачыў Алег Раманаў.

Другая частка форуму патрыятычных сіл пройдзе ў Александраўскім скверы, што побач з Купалаўскім тэатрам. Тут адбудзецца канцэрт артыстаў беларускай эстрады. Пачатак у 19.00, але арганізатары запрашаюць гасцей да 18.30.

---

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Запарожскай вобласці правядуць рэферэндум аб уз'яднанні з Расіяй

**Кіраўнік Запарожскай вобласці Яўген Баліцкі падпісаў распараджэнне аб правядзенні ў рэгіёне рэферэндуму па ўз'яднанні з Расіяй. Пра гэта паведаміў карэспандэнт РІА «Навіны».**

Дакумент быў падпісаны ў рамках форуму грамадскага руху Запарожскай вобласці «Мы разам з Расіяй» у Мелітопалі. У мерапрыемстве прынялі ўдзел больш за 700 дэлегатаў з усёй вобласці. Усе прысутныя аднагалосна падтрымалі рашэнне правесці рэферэндум аб уз'яднанні Запарожскай вобласці з Расіяй.

Член галоўнай рады адміністрацыі Запарожскай вобласці Уладзімір Рогаў раней заявіў, што рэгіён узяў курс на ўз'яднанне з Расеяй і «зваротнага шляху не будзе». Паводле яго слоў, у Кіеве вядома аб настроях людзей на падкантрольных Расіі тэрыторыях, таму спрабуюць пагражаць мірнаму насельніцтву і абстрэльваюць аб'екты грамадзянскай інфраструктуры. Паведамлялася таксама, што рэферэндум аб статусе рэгіёна можа прайсці ў першай палове верасня.

У сваю чаргу, прэзідэнт Украіны Уладзімір Зяленскі ў сваім тэлеграм-канале напісаў, што рэферэндумы ў паўднёвых абласцях краіны перакрыюць для Расіі любую магчымасць для мірных перагавораў.

## Гадавая інфляцыя ў Літве дасягнула рэкордных 21,6 %



**У ліпені ў Літве гадавая інфляцыя дасягнула рэкордных паказчыкаў і склала 21,6 % у параўнанні з паказчыкам за аналагічны леташні перыяд. Пра гэта паведамляе РІА «Навіны» са спасылкай на даныя дэпартамента статыстыкі гэтай краіны.**

«Найбольшы ўплыў на гадавую інфляцыю аказаў рост цэн на паліва, малако і малочныя прадукты, сыр, яйкі, цеплаэнергію, электраэнергію, хлеб і зерневыя прадукты, цвёрдае паліва, мяса і мясапрадукты, газ, паслугі кафэ, рэстаранаў і падобных устаноў, паслугі па рамонце і тэхагляду асабістых транспартных сродкаў, на масла і тлушчы, а таксама гародніну», — удакладнілі ў ведамстве.

Па звестках дэпартамента, цэны на прадукты спажывання за год павысіліся на 25,6 %, на паслугі — на 12,3 %. Па выніках чэрвеня гадавая інфляцыя ў краіне вырасла да 20,5 %.

## Названы еўрапейскія краіны з самым вялікім адтокам турыстаў

**Краіны Усходняй Еўропы, у тым ліку якія мяжуюць з Украінай, больш за ўсё пацярпелі з-за адтоку турыстаў. Аб гэтым піша CNN.**

Па даных Венгерскага агенцтва па турызме, за першыя шэсць месяцаў 2022 года колькасць турыстаў у краіне скарацілася на 37 працэнтаў у параўнанні з 2019 годам.

Туры ў Польшчу сталі адмяняцца замежнікамі на 40 працэнтаў часцей, удакладніў намеснік міністра спорту і турызму рэспублікі Анджэй Гут-Маставой.

Турыстычныя бюро адзначылі, што ў Славакіі назіраецца самы вялікі адток замежных турыстаў: са студзеня па май ён склаў 49 працэнтаў (у параўнанні з 2019 годам). У Літве гэты паказчык роўны 39 працэнтам. Эксперты лічаць, што некаторыя вандроўцы баяцца прыязджаць ва Усходнюю Еўропу з-за пандэміі, аднак большая частка спецыялістаў назвала асноўнай прычынай занепакоенасць з-за канфлікту ва Украіне.

Нас віншуюць

# СВЯТОЧНАЯ ДАТА Ў РОСКВІЦЕ ТВОРЧЫХ СІЛ

**Паважаны Аляксандр Мікалаевіч, работнікі і ветэраны рэдакцыі выдання!**

Ад імя Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і сябе асабіста віншую вас са 105-годдзем з дня выхаду першага нумара «Звязды».

Адна з найстарэйшых у нашай краіне, адзіная штодзённая газета на беларускай мове сустракае чарговую святочную дату ў росквіце творчых сіл. «Звязда» нязменна адпавядае сваім прыярытэтам — усебаковае асвятленне дзяржаўнай палітыкі, дзейнасці кіраўніцтва краіны, органаў дзяржкіравання. І, вядома, асаблівую ўвагу надае захаванню культуры і чысціні беларускай мовы, выхаванню пачуцця гонару за свой народ, за сваю Радзіму, за яе слаўную багатую гісторыю.

Газета заўсёды адрознівалася аб'ектыўнасцю і грунтоўнасцю ацэнак, адкрытасцю для шчырага і сумленнага дыялогу, жывой зваротнай сувяззю з людзьмі, дзякуючы чаму заняла годнае месца сярод айчынных сродкаў масавай інфармацыі. Новыя формы падачы матэрыялаў, актуальныя і цікавыя рубрыкі, прымяненне сучасных дызайн-тэхналогій сведчаць аб яе высокім прафесійным патэнцыяле.

У гэты дзень хачу падзякаваць ветэранам, якія пачыналі гісторыю выдання. Іх адказная праца стала прыкладам адданасці журналісцкай справе і самаахвярнага служэння нацыянальным інтарэсам, ідэйным арыенцірам для маладога пакалення і каштоўнасным падмуркам для цяперашніх поспехаў «Звязды».

Упэўнена, што згуртаваная каманда таленавітых, неабыякавых, матэнакіраваных спецыялістаў будзе і надалей спрыяць росту папулярнасці і аўтарытэту газеты, а таксама ўносіць важкі ўклад у развіццё нацыянальнай медыясферы.

Шчыра жадаю ўсім невычэрпнага творчага натхнення, стабільна высокага ўзроўню чытацкага даверу і новых дасягненняў у імя роднай Беларусі. Моцнага здароўя, дабрабыту і ўдачы вам і вашым блізкім.

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Н. І. КАЧАНАВА.**

**Паважаныя супрацоўнікі газеты «Звязда»!**

Ад імя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і ад сябе асабіста віншую вас са 105-годдзем з дня выхаду першага нумара выдання.

Аўтарытэт і прызнанне газеты грунтуюцца на гераічных традыцыях мінулага і адданасці справе яе калектыву, важкасці друкаванага слова, праўдзівасці інфармацыі.

Увесь час «Звязда» на вастрыі падзей вядзе ўзважаны даверлівы дыялог з чытачамі, імкліва развівае тэхналагічныя і творчыя магчымасці.

Асаблівую ўдзячнасць хачу выказаць вам за плённае супрацоўніцтва з Палатай прадстаўнікоў, за магчымасць абазначыць дэпутацкую пазіцыю па самых актуальных пытаннях грамадска-палітычнага жыцця.

Ад усёй душы жадаю вам далейшых поспехаў, моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту. Няхай ваша праца заўсёды атрымлівае самую высокую ацэнку галоўных экспертаў — чытачоў.

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь У. П. АНДРЭЙЧАНКА.**

**Паважаныя сябры!**

Шчыра віншую калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» са 105-годдзем з дня выхаду ў свет першага нумара выдання.

Заснаваная яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі, «Звязда» заўсёды была своеасаблівым летапісцам шматграннага жыцця нашага народа, захавальнікам найлепшых нацыянальных традыцый, мовы і культуры, духоўных каштоўнасцяў і маральных ідэалаў беларусаў.

На працягу многіх дзесяцігоддзяў выданне аб'ектыўна і ўсебакова асвятляла разнастайныя падзеі грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця, унесла значны ўклад у прапаганду найлепшых духоўных і культурных традыцый нашага народа.

Сёння, у Год гістарычнай памяці, варта адзначыць, што ваша выданне не спыняла свайго існавання і ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Менавіта ў памяць аб мужнасці і самаадданасці супрацоўнікаў рэдакцыі адзін з найпрыгажэйшых праспектаў беларускай сталіцы атрымаў імя двойчы ардэнаноснай газеты «Звязда».

Упэўнены, што і надалей калектыў рэдакцыі будзе трымацца абранага курсу служэння праўдзе жыцця, захавае вернасць свайму прафесійнаму і грамадзянскаму абавязку.

Жадаю супрацоўнікам газеты шчасця, здароўя і дабрабыту, шчырай удзячнасці чытачоў, новых творчых поспехаў у працы на карысць роднай Беларусі.

**Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Уладзімір ПЯРЦОЎ.**

Жніво-2022

## ЁСЦЬ МІЛЬЁН НА БРЭСТЧЫНЕ!

**Сёння аграрыі Брэсцкай вобласці пераадолелі рубеж у мільён тон намалоту збожжа. З гэтай падзеяй працаўнікоў вёскі павіншаваў старшыня аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА.**



Губернатар прыехаў у поле да земляробаў «АграНіва» Камянецкага раёна. Дарэчы, камянецкія камбайнеры намалацілі 1000 тон зерня. Амаль даганяюць іх па намалоце хлебаробы Столінскага і Пружанскага раёнаў.

Усяго на Брэстчыне ўбрана ўжо каля 70 працэнтаў збожжавых і зернебабовых культур. Кіраўнік вобласці адзначыў, што два дзясяткі гаспадарак ужо справіліся з уборкай і пачынаюць дапамагаць суседзям.

Юрый Шулейка адзначыў, што сёлета ўраджайнасць практычна ўсіх культур вышэйшая за леташнюю. Чакаецца, што ў рэгіёне будзе атрымана 1 мільён 350 тысяч тон збожжа без уліку кукурузы. Зараз сабрана 99 працэнтаў рапсу, сабраны лён, глеба рыхтуецца да пасеву азімага рапсу.

Яшчэ губернатар паведаміў журналістам, што абласныя дажынкі пройдуць сёлета 3 верасня ў Целяханах Івацэвіцкага раёна. Пасёлак рыхтуецца да свята.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Фота з сайта газеты «Заря».**

Надвор'е

## Яшчэ пагрэемся!

**Пацяпленне напрыканцы тыдня абяцаюць сіноптыкі ў Беларусі. Аб гэтым БелТА паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Паводле інфармацыі сіноптыкаў, у найбліжэйшыя дні з паўночна-заходнімі патокамі на тэрыторыю Беларусі працягне паступаць халаднаватая паветраная маса. Істотных ападкаў па краіне не прагназуецца.

У сераду, 10 жніўня, чакаецца пераважна без ападкаў, толькі днём у асобных раёнах па паўднёвым захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Уначы і раніцай месцамі слабы туман. Тэмпература паветра ўначы дасягне плюс 8—15 градусаў. Днём слупок тэрмометра паднімецца да плюс 20—26.

У чацвер, 11 жніўня, сіноптыкі таксама абяцаюць пераважна без ападкаў. Уначы тэмпература паветра будзе вагацца ад плюс 8 да плюс 15 градусаў. Днём паветра прагрэецца да 22—28 градусаў цяпла.

Па папярэдніх прагнозах, у канцы тыдня чакаецца тэндэнцыя да пацяплення. Так, у пятніцу, 12 жніўня, будзе пераважна без ападкаў. У начны час тэмпература паветра складзе плюс 8—15 градусаў, а па поўдні краіны чакаецца да плюс 17 градусаў. Максімальная тэмпература днём будзе плюс 24—30 градусаў.

У суботу, 13 жніўня, пераважна па паўднёвай палове краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, а ў асобных раёнах навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 10—17 градусаў, а па поўдні — плюс 19 градусаў. Днём паветра прагрэецца да плюс 24—30 градусаў, у паўднёвых раёнах — да 32 градусаў цяпла.

У нядзелю, 14 жніўня, месцамі прагназуюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Уначы — плюс 12—18 градусаў, а па поўдні — плюс 20 градусаў. Днём слупок тэрмометра падымецца да плюс 24—30 градусаў, па поўдні краіны — да 32.

Сезон

## АДКРЫВАЕЦЦА ПАЛЯВАННЕ НА ПТУШКУ

**З 13 жніўня ў Беларусі адкрываецца летне-асенні сезон палявання на вадаплаўную (акрамя гусей) і балотную дзічыну, слонку, вяхіра, шызага голуба, перапёлку і фазана.**

Як паведамляе Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету, гэтае паляванне дазволена ў светлы час сутак ружэйным (з засады, з падыходу, з пад'езда з прымяненнем маламерных суднаў без рухавікоў, або з выключанымі рухавікамі) і безружэйным (з выкарыстаннем ловчых птушак) спосабамі. Падчас збройнага палявання дазваляецца выкарыстанне гладкаствольнай паляўнічай зброі і патронаў са шротам, выкарыстанне паляўнічых сабак, акрамя ганчакоў і хартоў.

З 3 верасня пералік дазволеных да здабычы паляўнічых відаў птушак дапоўніцца рабчыкам і шэрай курапаткай, а з 17 верасня — гуссю белалобай, гуссю-гуменнікам, гуссю шэрай і канадскай казаркай. Прадоўжыцца летне-асенні сезон палявання на птушыную дзічыну да 11 снежня.

У Дзяржінспекцыі нагадалі, што ў працэсе палявання дапускаецца здабыча толькі паляўнічых відаў птушак (згодна з дадаткамі 1 і 3 да Правілаў палявання), указаных у паляўнічай пуцёўцы.

Акрамя таго, пры любым законным знаходжанні ў паляўнічых угоддзях у мэтах палявання паляўнічым дазваляецца таксама здабыча ваўка, шакала, лісіцы, янотападобнага сабакі, шэрай вароны, сарокі з выкарыстаннем спосабаў і прылад, дазволеных для палявання.

Здабыча ў працэсе палявання дзікіх жывёлін, не аднесеных да паляўнічых або не ўказаных у паляўнічай пуцёўцы (за выключэннем пералічаных вышэй паляўнічых жывёлін), з'яўляецца незаконным паляваннем і цягне адміністрацыйную (частка 1 артыкула 16.27 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях) адказнасць, а таксама абавязацельства кампенсацыі парушальнікам прыродаахоўнага заканадаўства шкоды, прычыненай навакольнаму асяроддзю ў выніку незаконнага адабрання гэтых жывёлін.

«Звяртаем асаблівую ўвагу паляўнічых на неабходнасць няўхільнага захавання ў працэсе палявання патрабаванняў правілаў яго бяспекі, выкладзеных у Правілах палявання. Практыка паказвае, што невыкананне гэтых патрабаванняў з'яўляецца асноўнай прычынай няшчасных выпадкаў на паляванні, у тым ліку якія пацягнулі гібель людзей. Акрамя таго, парушэнне правілаў бяспекі палявання цягне адміністрацыйную адказнасць (часткі 5 і 6 артыкула 16.27 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях) у выглядзе штрафу ў памеры да 15 базавых велічынь, а ў выпадку паўторнага парушэння на працягу года — ад 10 да 30 базавых велічынь або пазбаўлення права палявання».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# НАРОДЖАНЫЯ ПАД ЗНАКАМ «ЗВЯЗДЫ»

**Дбаць пра харчовую бяспеку краіны працягвае цёзка газеты «Звязда» — аднайменнае сельгаспрадпрыемства ў Чачэрскім раёне. Яго калектыў перакананы: зорнае імя 92 гады таму гаспадарка магла атрымаць менавіта ў гонар аднаго з першых выданняў Беларусі. Апошнім часам адкрытае акцыянернае таварыства ў беларускамоўным варыянце на афіцыйных дакументах носіць назву «Зорка». Але калектыў адчувае сябе менавіта «звяздоўцамі». У юбілейную дату, якая выпала на самую гарачую пару — жніво, карэспандэнт «Звязды» завітала на Чачэршчыну.**

Аб дасягненнях ААТ «Зорка» ведаюць далёка за межамі Чачэрскага раёна. Сельгаспрадпрыемства за апошнія 15 гадоў па праве заваявала статус аграрнага лідара гомельскага Засажэўя. У акцыянернае таварыства аб'яднана пяць гаспадарак — колішнія саўгасы «Бяляеўскі» і «Сож-1», КСУП «Нісімкавічы» і «Звязда», у даверным кіраванні галаўнога прадпрыемства таксама мясцовая гаспадарка «Палессе». Сям'я ж «звяздоўцаў» — каля 200 чалавек. Працуюць людзі і з Чачэрска, і з населеных пунктаў, што знаходзяцца на тэрыторыі іншых гаспадарак.

— З намі той, хто жадае годна працаваць і годна жыць, — перакананa дырэктар ААТ «Зорка», адна з самых вядомых жанчын-кіраўнікоў сельгаспрадпрыемстваў у краіне, узнагароджаная медалём «За працоўныя заслугі» Галіна Трыбунах.

За ўсю гісторыю існавання ў «звяздоўскага» калектыву было толькі сем кіраўнікоў. Галіна Пятроўна — сёмы кіраўнік, а ўзначаліла гаспадарку ў 2007 годзе. Магія лічбаў таму віной ці не, дырэктар не ведае, але менавіта гэта работа стала лёсавырашальнай не толькі для Галіны Пятроўны, але для ўсіх членаў яе сям'і. Кіраванне гаспадаркай — справа жыцця і для яе мужа, Сяргея Васільевіча. Ён — і другая палавінка, і правая рука, і памочнік ва ўсіх справах. Сяргей Трыбунах — намеснік дырэктара, якім ганарыцца калектыў.

— Мы заўсёды прытрымліваемся правіла ў рабоце: дзяржаўныя пытанні вышэй за ўсё. Стабільная работа нашай гаспадаркі — гэта задача, якую паставіла краіна перад маім калектывам, і яе абавязкова трэба выканаць. Калі ёсць праблемы са спецыялістам у рабоце, абавязкова знайду падыход, — расказвае Галіна Трыбунах.

З дырэктарам ААТ «Зорка» выязджаем у поле. Тэрыторыя гаспадаркі значная па плошчы. За дзень кіраўнік, здараецца, наведваючы толькі асноўныя аб'екты прадпрыемства, за рулём машыны пераадольвае да 350 кіламетраў. Цяпер самы гарачы сезон для аграрыяў — гэта і час выпрабавання, як наладжана ў калектыве работа супрацоўнікаў машынна-трактарнага парка, тлумачыць Галіна Пятроўна. Хоць, перакананa, у сельскай гаспадарцы «не гарачых» сезонаў увогуле няма. Праца на зямлі — няспынная, бы само жыццё.

— Цяпер працягваем убіраць збожжавыя культуры, прэсуем саломку, звозім з палёў, рыхтуемся да сяўбы азімага рапсу, пачынаем рыхтаваць глебу, — пералічвае дырэктар гаспадаркі. — Між тым кожны з нашых працаўнікоў разумее, што хлеб павінен быць на стале ў кожнай беларускай сям'і, і гэта не пустыя словы для нашага калектыву. Перад пачаткам уборачнай кампаніі, калі збіраемся з супрацоўнікамі, я заўсёды заклікаю: лічыце, што мы зараз з вамі на фронце. Мы выйшлі ў поле, і для нас няма больш шляху назад. Мы павінны ісці хутка і толькі наперад, прыбраць тое, што выгадавала зямелька наша, павінны ўсё сабраць і пакласці ў засекі, адправіць у дзяржзаказ, — перакананa кіраўнік ААТ «Зорка».



**Дырэктар ААТ «Зорка» Чачэрскага раёна Галіна ТРЫБУНАХ аглядае ўраджай сланечніка.**

Сумленная праца на зямлі абавязкова адгукнецца добрым заробкам, гэта таксама правіла «звяздоўцаў».

— Перад выездам у поле кожны камбайнер атрымлівае папку з расцэнкамі за тону намалочанага збожжа. Пасля змены кожны ўжо ведае, колькі зарабіў за дзень. Цяпер, у сезон, толькі за адзін месяц механізатары, задзейнічаныя на ўборачнай, атрымліваюць звыш шасці тысяч рублёў. Гэта вельмі матывуе супрацоўнікаў. У цэлым жа за першае паўгоддзе бягучага года сярэдняя заработная плата ў нашай гаспадарцы склала звыш 1,7 тысячы рублёў, — тлумачаць галоўны эканаміст і галоўны бухгалтар ААТ «Зорка» Святлана Каржова і Валянціна Іваненка.

Сёння ў гаспадарцы адмовіліся ад практыкі браць падчас жніва ў памочнікі камбайнера непрафесійна падрыхтаваных спецыялістаў. Ставяць перад супрацоўнікамі задачу, каб на любым этапе ўборкі памочнік камбайнера мог цалкам замяніць старэйшага ў экіпажы, стаць паўнавартасным членам брыгады па рамонце тэхнікі падчас жніва. Гэта дазваляе ў тым ліку максімальна хутка нават у полі адрамантаваць машыны і мінімізаваць іх прастоі ў полі.

Ёсць у «звяздоўцаў» і яшчэ адно абавязковае правіла ў рабоце — быць шматпрофільнымі спецыялістамі. Напрыклад, маладыя кадры — загадчык рамонтных майстэрань Максім Макарэвіч і інжынер па выпуску сельгастэхнікі Аляксей Нарушаў — могуць працаваць на любой сельгастэхніцы і падтрымаць, дапамагчы супрацоўнікам сваіх падраздзяленняў на ўсіх этапах работы.

— Створана ў гаспадарцы і моцная каманда па рамонце машынна-трактарнага парка. Акрамя таго, самі механізатары вельмі адказна ставяцца да тэхнікі, на якой працуюць, — зазначае Галіна Трыбунах і з гонарам пералічвае імёны найлепшых з найлепшых у камандзе трактарыстаў-машыністаў: Уладзімір Дзятлаў, Іван Павілкоў, Сяргей Куркоў, Мікалай Брайкоў, Аляксандр Каплуноў. Гонар калектыву, па словах кіраўніка гаспадаркі, — галоўны інжынер Віталь Кандраценка і галоўны аграном Уладзімір Сахараў.

У арсенале гаспадаркі сёння — 10 збожжаўборачных камбайнаў: палова — новенькіх, набытых у тым ліку па Указе Прэзідэнта № 146.

— Дзякуй Аляксандру Рыгоравічу: як бы ні было складана, як бы ні было цяжка, заўсёды сельская гаспадарка атрымлівае адчувальную падтрымку кіраўніка дзяржавы. Указ Прэзідэнта дае магчымасць аграрыям набываць любую тэхніку і трактары айчыннай вытворчасці. Так, летась мы набылі два збожжаўборачныя камбайны і яшчэ два — сёлета. Адзін камбайн, набыты зусім нядаўна таксама па 146-м указе, але ўжо за бюджэтныя грошы, — гэта падтрымка гаспадаркі ад кіраўніка Гомельскай вобласці Івана Крупко, — тлумачыць Галіна Трыбунах.

Добрая тэхніка на ўзбраенні аграрыяў — гарантыя таго, што і надалей гаспадарка зможа высокімі тэмпамі развіваць свой асноўны кірунак — жывёлагадоўлю. На пяці фермах ААТ «Зорка» — больш за пяць тысяч галоў буйной рагатай жывёлы. Штодня ад «звяздоўскіх» рагуль на перапрацоўку на Рагачоўскі малочны камбінат пастаўляецца 34 тоны малака.

— У нас ёсць кароўкі, якія даюць больш за дзевяць тон малака. Такія добрыя вынікі па надоях — гэта праца не аднаго дня, а працяглай сістэмнай работы, — падкрэслівае галоўны заатэхнік ААТ «Зорка» Алена Малашкіна і расказвае, што яе даяркі і заатэхнікі ведаюць усіх сваіх каровак «у твар», як кажуць, адносяцца з вялікай пяшчотай і клопатам, даюць ім мянушкі.

Алена Ціханаўна, якая сама 20 гадоў жыцця аддала рабоце галоўным заатэхнікам, перакананa, што работа з жывёлай самая цікавая і вельмі адказная.

— Я заўсёды кажу сваім жывёлаводам, што ў нас такая вытворчасць: гэта як мартэнаўская печ — калі яе спыніць, усё прападзе дарэмна. Таму ў нашай рабоце няма такога, што мы дабіліся паказчыкаў добрых і сядзім спакойна. Калі прыйшла працаваць у гаспадарку, крыху больш за тры тоны малака даілі, а цяпер — амаль 35, але гэта нагода толькі яшчэ больш развівацца і ўдасканальваць работу, — дзеліцца Алена Малашкіна.

Дарэчы, прозвішча галоўнага заатэхніка ў ААТ «Зорка» таксама праслаўляе чарговую працоўную дынастыю. Агульны працоўны стаж — больш чым 30 гадоў — за плячыма мужа Алены Ціханаўны Фёдара Малашкіна і яго брата Рыгора Малашкіна. Праслаўляе працоўную сямейную дынастыю малады супрацоўнік, які ўзначальвае МТФ на 600 галоў буйной рагатай жывёлы, Яўген Нарушаў.

— На працу іду з задавальненнем, — шчыра дзеліцца Яўген Віктаравіч, бацька якога доўгі час прапрацаваў у роднай гаспадарцы трактарыстам. — Скончыў універсітэт і прыйшоў працаваць сюды па сваёй спецыяльнасці праграмістам. Пасля прапанавалі заняць пасаду загадчыка МТФ, пагадзіўся і не пашкадаваў. Працуем зладжана.

Увогуле, зладжана працуе ўся каманда «звяздоўцаў». Кіраўнік калектыву Галіна Трыбунах упэўнена: фірмовы стыль яе супрацоўнікаў — менавіта сумленная праца.

— Памятаю добра, што, калі толькі прыйшла працаваць сюды дырэктарам, у адно імгненне разумела, з кім з кіраўнікоў падраздзяленняў, адказных спецыялістаў спрацуемся, а з кім — не. Наш чалавек — гэта той, хто якую высокую пасаду ў гаспадарцы не займаў, ніколі не пройдзе міма простага рабочага, якому патрэбна дапамога, — закасае рукавы і шчыра дапаможа. Сёння ў нас працуюць добрыя маладыя спецыялісты і надзейныя працаўнікі са значным стажам работы. З такой камандай, перакананa, мы зможам усё.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Трест Белсантехмонтаж №1», г. Минск, ул. Я. Колоса, 23, к. 1** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов: комплекс недвижимого имущества, реализуемого одним лотом, расположенных по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Западная, 19**

| Наименование (назначение) | Инв. № | Общ. пл., кв. м | Адрес (№ дома) | Стоимость, BYN |
|---|---|---|---|---|
| Здание гаража на 3 автомашины (здание специализированное автомобильного транспорта) | 710/С-73112 | 66 | д. 19/2 | 7 872,00 |
| Изолированное помещение № 1 (складское помещение) | 710/D-80985 | 305,4 | д. 19/1-1 | 43 680,00 |
| Изолированное помещение № 2 (складское помещение) | 710/D-80986 | 318,4 | д. 19/1-2 | 45 552,00 |
| Изолированное помещение № 3 (помещение многофункциональное) | 710/D-80987 | 1340,6 | д. 19/1-3 | 191 520,00 |
| Изолированное помещение № 1 (административное помещение) | 710/D-80973 | 11,5 | д. 19-1 | 3 984,00 |
| Изолированное помещение № 2 (административное помещение) | 710/D-80974 | 13,5 | д. 19-2 | 4 656,00 |
| Изолированное помещение № 3 (помещение, не относящееся к жилищному фонду) | 710/D-80975 | 46,8 | д. 19-3 | 16 224,00 |
| Изолированное помещение № 4 (складское помещение) | 710/D-80976 | 15,6 | д. 19-4 | 5 424,00 |
| Изолированное помещение № 5 (помещение общественного питания) | 710/D-80977 | 47,1 | д. 19-5 | 16 320,00 |
| Изолированное помещение № 6 (складское помещение) | 710/D-80978 | 13,9 | д. 19-6 | 4 800,00 |
| Изолированное помещение № 7 (административное помещение) | 710/D-80979 | 18,7 | д. 19-7 | 6 480,00 |
| Изолированное помещение № 8 (административное помещение) | 710/D-80980 | 14,9 | д. 19-8 | 5 184,00 |
| Изолированное помещение № 9 (административное помещение) | 710/D-80981 | 23,3 | д. 19-9 | 8 064,00 |
| Изолированное помещение № 10 (административное помещение) | 710/D-80982 | 10,9 | д. 19-10 | 3 792,00 |
| Изолированное помещение № 11 (административное помещение) | 710/D-80983 | 11,1 | д. 19-11 | 3 840,00 |
| Изолированное помещение № 12 (административное помещение) | 710/D-80984 | 295,5 | д. 19-12 | 102 240,00 |

К каждому из изолированных помещений относится **общее имущество** (отмечено в технических паспортах к объектам недвижимости: тамбур (1,7 кв. м), коридор (43,8 кв. м), умывальник (1,6 кв. м), коридор (3,5 кв. м), туалет (1,4 кв. м), туалет (1,4 кв. м), туалет (3,1 кв. м), туалет (1,8 кв. м), умывальник (1,5 кв. м), тамбур (1,7 кв. м), тамбур (1,6 кв. м), лестничная клетка (13,0 кв. м), лестничная клетка (13,1 кв. м)

Земельный участок общ. пл. 2,3800 га предоставлен на праве постоянного пользования для размещения производственной базы

Ограничения/обременения: аренда

В состав лота входит следующее **иное имущество**: ограждение ж/б с распашными воротами (инв. № 653-Б), стоимость 12816,00 BYN, опоры освещения (12 шт.) (инв. № 025-Б), стоимость 1 728,00 BYN, асфальтная площадка (инв. № 654-Б), стоимость 14 112,00 BYN, тепловая сеть (инв. № 039-Б), стоимость 10 800,00 BYN, навес для хранения дров (инв. № 166-Б), стоимость 403,20 BYN, навес для кислорода (инв. № 165-Б), стоимость 768,00 BYN. Переход права собственности на указанное имущество будет осуществлен **после получения правоустанавливающих документов**, подготовка и оформление которых будет возложено на победителя электронных торгов либо единственного участника электронных торгов, согласившегося приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – покупатель). **Срок подписания договора купли-продажи указанного имущества: 18 месяцев после проведения аукциона.** Продавец составляет и направляет договор для подписания покупателю

**Начальная цена лота: 510 259,20 бел. руб. (с НДС 20 %).**
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by

**Задаток 10 % от начальной цены лота** перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней после проведения аукциона**. Продавец составляет и направляет договор для подписания покупателю

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **10 календарных дней** после заключения договора купли-продажи. Передача предмета электронных торгов осуществляется в течение **10 календарных дней** после полной оплаты. Оплата всего имущества осуществляется на расчетный счет третьего лица

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Покупатель обязан возместить организатору торгов **затраты** на их проведение и оплатить **вознаграждение 2 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда 28.06.2022

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 30.08.2022 с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **29.08.2022 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

# Моцныя людзі з глыбінкі

**«Свайго героя трэба палюбіць, тады атрымаецца добры матэрыял», — гаварыла нам выкладчыца на першым курсе. І тлумачыла, як важна прасякнуцца сімпатыяй на час работы над тэкстам, тады, паводле яе слоў, нашмат лягчэй пішацца. Усё аказалася так. Але тады я яшчэ не ведала, што некаторыя героі застаюцца на ўсё жыццё не проста ў памяці, але і ў душы. Пра іх час ад часу згадваеш, нібы энергіяй падсілкоўваешся альбо іх параду слухаеш. Іншымі проста захапляешся.**

## Выгадаваць шэсць сірот

Вось такімі, напрыклад, як Галіна і Яўген Арцюхі з Івацэвіцкага раёна. Звычайныя людзі з глыбінкі: жылі ў райцэнтры, працавалі, гадавалі траіх дзяцей. І раптам адна падзея змяніла іх жыццё. Але аб усім па парадку.

Далёкія сваячкі Люба і Галя сябравалі з дзяцінства. Разам раслі, у школу хадзілі, дамашнія заданні выконвалі, першымі дзявочымі сакрэтамі дзяліліся. Потым, каб не расставацца, паступілі разам у пружанскую школу кухараў — была тады такая. Набылі спецыяльнасці, пайшлі на свой хлеб, замуж амаль адначасова павыходзілі. Галя з Яўгенам атрымалі кватэру ў Івацэвічах. Трое дзяцей хадзілі ў школу. Галіна ўжо стала намесніцай загадчыцы магазіна. А Пазнякі — Люба з Мікалаем — звілі сваё гняздо ў Целяханах. Бог дзецьмі не абдзяліў, нарадзілася шасцёра. Каб іх карміць-апранаць, бацькі круціліся з цямна да цямна, гаспадарку вялікую трымалі, працавалі. Сяброўкі цяпер сустракаліся рэдка, яно і вядома: у кожнай свае клопаты.

А 1 сакавіка 2001 года здарылася трагедыя. Любоў і Мікалай Пазнякі загінулі ў аўтакатастрофе. Арцюхі прыехалі на іх пахаванне. Уся вялікая радня і блізкія сябры сабраліся ў асобным пакоі на вялікую раду — трэба было вырашыць, што рабіць з дзецьмі. Сёй-той выказваў нясмелую згоду ўзяць да сябе адно дзіця. Пра тое, каб узяць усіх, гутаркі, вядома, не ўзнікала. Было зразумела, што аддаць усіх разам у адзін інтэрнат таксама немагчыма: маленькага забяруць у дом дзіцяці, чатырохгадовага — у дзетдом дашкольнага профілю, школьнікаў — у школы-інтэрнаты. Тады яшчэ практычна не было дзіцячых дамоў сямейнага тыпу... Ніхто не ведаў, што рабіць і нават што сказаць у такой сітуацыі... Галі тэрмінова спатрэбілася па нешта пайсці ў дальні пакой, і па дарозе яна натрапіла на дзяцей, якія сабраліся ў купку і гаварылі між сабой. Аказалася, яны ўжо самі, без дарослых, вырашылі, як «жыць далей»: малых нікуды не аддаваць, у інтэрнат не ехаць, па чарзе прапускаць школу і даглядаць малодшых братоў. І зайшлося ў яе ад болю сэрца, і ў тую самую хвіліну яна прыняла для сябе рашэнне.

Не ведала адразу, як загаварыць пра гэта з мужам. Нельга сказаць, што ён адразу згадзіўся. Як і любы мужчына, што больш кіруецца розумам, а не эмоцыямі, некалькі разоў спытаў у жонкі, ці ведае яна, на што ідзе. І яна цвёрда адказала: «Ведаю».

Але ж не ведала пэўна і дзясятай долі, бо ёсць рэчы, якія нельга прадугледзець альбо ведаць наперад. Іх можна спазнаць толькі асабістым вопытам. І хоць работы ніколі не баялася, не думала, што можна правальвацца ў сон, як толькі дойдзеш да ложка. Не ўяўляла, што ад роднай дачкі можна пачуць: «Цяпер сіротамі будуць не яны, а мы». Вядома, напачатку ўсю ўвагу, усю ласку бацькі аддавалі тым дзецям, якія перажылі гора, каб іх падтрымаць, і не заўважалі, што свае засталіся нейк нібы на другім плане. І вось яны, простыя людзі, што ніколі не вывучалі ні педагогіку, ні псіхалогію, самі спасцігалі тонкую грань бацькоўскіх адносін, з якой нельга збочыць, каб ніводнае з дзяцей не адчувала сябе прывілеяваным альбо абдзеленым. Неўзабаве стала ўсё па-роўну, стаўленне да ўсіх аднолькавае, як у адной вялікай сям'і. Але ж як нялёгка было прыйсці да гэтага! У кожнай сям'і ёсць свае прывычкі, традыцыі, і злучыць дзве сістэмы бязбольна здавалася часам немагчымым. Ды Арцюхам хапіла цярпення, мудрасці ўсё пераадолець. Якіх намаганняў гэта каштавала, ведаюць толькі яны.

Ім прыйшлося памяняць усё, пераехаць з горада ў пасёлак. Бо ў сваёй двухпакаёвай кватэры сям'ю з 11 чалавек не размесціш. Спачатку жылі ў доме Пазнякоў, таксама невялікім, большы па плошчы дом дапамог купіць віноўнік аварыі. Сталі яго добраўпарадкаваць, даводзіць да ладу. Гаспадар на ўсе рукі майстар. Неўзабаве ўзвёў асобную кухню са сталовай і рускай печчу. У доме больш не гатавалі, усе гаспадарчыя клопаты перанеслі сюды. А варыць-парыць кожны дзень трэба было ой як многа! Толькі праз два гады правялі ў дом ваду, купілі пральную машыну-аўтамат, а да гэтага больш за паўдня ў суботу трацілі, напрыклад, на тое, каб нанасіць вады, усіх выкупаць, вынесці ваду. Мыццё бялізны наогул было бясконцай работай. Завялі вялікі агарод, разбілі цяпліцы. Дзеці ва ўсім сталі дапамагаць, пакрысе жыццё набыло рытм, а з часам афармілі сямейны дзіцячы дом, і Галя з Яўгенам сталі атрымліваць зарплату і стаж.

Калі я была ў іх у гасцях у 2004 годзе, сям'я ўжо мела свой мікрааўтобус, яны зрэдку выязджалі на возера на адпачынак, ездзілі на экскурсіі. А яшчэ, што мяне ўразіла тады, чысціня і ўтульнасць. Старэйшыя дзеці ўжо былі ў выпускных класах, і ў бацькоў галава балела, як іх уладкоўваць далей. Крыху забягаючы наперад, скажу, што зараз Арцюхі маюць ужо 12 унукаў. А тады па дарозе ў Целяханы аўтар гэтых радкоў разгаварылася з вадзіцелем маршруткі, прасіла, каб падвёз бліжэй да дому. Аказалася, ён ведаў пра іх сям'ю. Дык вось ён сказаў, што такім варта даваць званне героя, бо адна справа — здзейсніць подзвіг імгненна, а іншая — свядома ахвяраваць сябе на подзвіг. Я расказала пра гэта Галі, яна засмяялася, гераіняй сябе не лічыла. Гаварыла пра добрых людзей, якія дапамагалі ім, у тым ліку з замежных дабрачынных арганізацый. Дапамагалі многія, хто разумеў, як важна, каб у дзіцяці была мама.

## Аддаць нырку сыну

Бо мама наогул можа калі не ўсё, дык многае. Напрыклад, падзяліцца ўласным здароўем, каб выратаваць жыццё сыну. Як зрабіла Алена Клімовіч з Ружан. Яна аддала сваю нырку сыну Аляксандру. У сына шмат праблем, не адна гэтая хвароба. Яе, таксама не вельмі моцную здароўем, тады не зразумелі многія, нават уласная маці. Толькі для Алены і пытанне не стаяла, як толькі даведалася, што можна ўзяць яе орган для перасадкі, адразу сказала доктару: «Я гатова да аперацыі».

На долю Алены выпала шмат выпрабаванняў у жыцці, але яна з усім спраўлялася. Яшчэ ў самым пачатку сямейнага жыцця, калі пасля нараджэння першынца ў яе раптам адняліся ногі, гэта быў шок для юнай жанчыны. Яе шмат лячылі, але ў выніку стала ледзьве перасоўвацца па доме. Усю хатнюю работу ўзяў на сябе муж. А маладой маці падказалі, што трэба нарадзіць зноў, маўляў, бывалі выпадкі. І праўда, пасля другіх родаў нібы ўсё само стала на месца. Алена змагла хадзіць. Гэта была першая іх сямейная перамога. Маладой сям'і з двума дзецьмі сельгаспрадпрыемства, дзе працаваў муж Уладзімір, выдзеліла дом. Хай не новы, але і тое было за шчасце. Сталі дабудоўваць, добраўпарадкаваць. Усё рабілі ў асноўным сваімі рукамі. Вось толькі Саша, малодшы сынок, рос хваравітым. Нават у школу не хадзіў, быў на надомным навучанні.


Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Клімовічы завялі вялікую гаспадарку, трымалі курэй і свіней, садзілі агарод, працавалі. А потым як маланка з нябёсаў: раптоўная хвароба мужа, шпіталізацыя. Аказалася, што гэта пухліна галаўнога мозгу з метастазамі. Апераваць было позна, ён літаральна згарэў у яе на руках. І ў няпоўныя сорак гадоў Алена засталася адна з дзецьмі і праблемамі.

З гадамі да іншых хвароб малодшага Сашы дадалася сур'ёзная паталогія нырак. Тры разы на тыдзень яны ездзілі ў Пружаны на працэдуру гемадыялізу. Урачы загаварылі пра перасадку. Яна сама прапанавала сябе ў якасці донара. Але ў яе чацвёртая група крыві з дадатным рэзусам, у сына — трэцяя з адмоўным. Дактары папярэджвалі, што нырка можа не прыжыцца, і тады ёй прыйшлося б выдаляць. Яе адгаворвалі сваякі і знаёмыя. Але яна даўно адчувала сябе галавой сям'і і прынятае рашэнне не мяняла. Аперацыю рабілі доўга, але неўзабаве прыйшоў урач і сказаў, што яе нырка запрацавала ў сына.

Потым быў доўгі шлях рэабілітацыі, строгія дыеты, таблеткі па 50 штук на дзень і больш на раскладзе. Дадаць сюды пастаянныя паездкі ў Брэст і Мінск да дактароў. Давялося на некаторы час пакінуць работу, бо сыну быў патрэбны пастаянны догляд. «Як гэта перажыла, асіліла, растлумачыць цяжка, — гаварыла Алена Мікалаеўна, проста рабіла ўсё, што трэба». І зрабіла ўсё магчымае.

Пры гэтым яна ўмудралася падтрымліваць сям'ю старэйшага сына, якая стала для яе крыніцай радасці і натхнення. Вярнулася на сваю фабрыку, развяла процьму кветак на падворку і сапраўдны хатні сад у пакоях. Алена пры ўсіх яе выпрабаваннях сумела захаваць здольнасць радавацца жыццю, яна заўсёды ўсміхаецца. Яе любімае выслоўе — «Усё будзе добра». Яна любіць сваю нявестку і ўнукаў, умее прыгожа ўладкоўваць сямейныя святы.

## Падарыць царкву жонцы

Падарыць сапраўднае свята блізкаму чалавеку, скажу я вам, не такая і лёгкая задача. А Рыгор Бондзіч з вёскі Ганчары Пінскага раёна падарыў жонцы... белую царкву з сінімі купаламі. Рыгор Максімавіч і Марыя Міхайлаўна былі людзьмі працавітымі і надзвычай набожнымі. Працавалі ўсё жыццё старанна і шмат, а яшчэ галава сям'і нярэдка ўзводзіў цэрквы, па некалькі месяцаў працаваў на такіх не зусім звычайных аб'ектах. Быў там і за цесляра, і за галоўнага кансультанта. Тлумачыў, як усё зрабіць па канонах, па правілах.

Жонку сваю ён заўсёды любіў і шанаваў. Аднойчы да свята напісаў яе партрэт на палатне. На той карціне Марыя назаўсёды засталася маладой і прыгожай. Гэта яна папрасіла яго пабудаваць царкоўку ва ўласным двары, бо з гадамі ёй стала цяжка хадзіць у суседнюю няблізкую вёску. Спачатку прыняў гэта як жарт. Але жонка на сваім настойвала, заводзіла гаворку ізноў, на цэглу паказала, якая засталася ад старой разабранай пабудовы. І паступова ўзяўся за працу. Пакуль рабіў падмурак, сцены, суседзям казаў, што лазню будуе, баяўся прызнацца ў 80-я гады, усяляк магла паставіцца ўлада да яго ідэі. Але паціху будаўніцтва працягвалася, і ў 1990 годзе царкоўка з сінімі купаламі была завершана. Усё там было як у сапраўдным храме: і алтар, і абразы, і свечкі. Парадак і прыгажосць з самага пачатку наведзены клапатлівай рукой Марыі Міхайлаўны. Праўда, першы варыянт царквы быў крыху меншы, потым па просьбе суседзяў Рыгор Максімавіч пабудову пашырыў. У яго царкву стала хадзіць ледзь не ўся вёска. У свой час царкву асвяціў уладыка Стэфан, епіскап Пінскі і Лунінецкі.

Калі я наведала Рыгора Бондзіча, яго любімай жонкі ўжо не было на свеце. У гонар яе ён падтрымліваў царкву, садзіў на падворку яе любімыя кветкі. Рыгор Максімавіч расказваў, што падлеткам быў вывезены ў Германію, пасля вяртання займаўся сельскай гаспадаркай, потым доўгі час працаваў на чыгунцы, а пасля выхаду на пенсію жыццё прысвяціў Богу, стаў будаваць храмы. Зрабіў і сваю на радасць жонцы. А калі ў Ганчарах многія пастарэлі і не змаглі хадзіць у Ахова за 10 кіламетраў, святар з вёскі Стаўкі стаў прыязджаць сюды, праводзіць службы, спавядаць, храм зажыў сваім жыццём. Гаспадар паказваў мне тады фотаздымак вянчання ўнучкі, якое праходзіла ў дзедавым храме. І цяпер, калі дзеда ўжо няма, унукі прыязджаюць, падтрымліваюць у парадку дзедаву святыню. А мяне гэты вясковы чалавек уразіў тады сваім уменнем прыгожа расказаць пра сваю жонку. Гаварыў, здаецца, проста, а колькі любові, павагі было ў словах. І жыў, як гаварыў, з павагай і пашанай.

Колькі іх, маіх герояў з глыбінкі, ужо пайшлі з жыцця, але застаюцца для мяне скарбніцамі народнай культуры і філасофіі. Адна з іх — Ульяна Кірылаўна Мельнік. Выпрабаванняў яе жыцця іншаму на тры жыцці хапіла б. 18-гадовай Ульяна выходзіла замуж за прыгожага хлопца Карнея. У 1944-м яго забралі на фронт, у 1945-м ёй прыйшла пахаванка. Яна засталася з двума малымі, ляжачай свякроўкай і гектарам зямлі, які трэба было абрабіць. Выжывала як магла, навучылася шыць, прыдбала машынку. Шыла, а ў якасці аплаты ёй дапамагалі ў полі. Потым брат падарыў фотаапарат, асвоіла фотасправу, стала фатографам на ўсю акругу. Так сустрэла свайго другога суджэнца. Франтавік Аляксандр прыйшоў да яе, каб зрабіць фота на дакументы. Мужа яна называла Оліс на палескі манер, пражыла з ім 35 гадоў. Расказвала, як сямейны дабрабыт будавала: «Не мела паняцця, як крычаць на мужа, ні з першым, ні з другім не ўчыняла сварак. Мой Оліс, як маладзейшы быў, то і выпіць мог. Бывае, прыйдзе дахаты п'янаваты і адразу да мяне: «Ульянка, дапамажы паспяваць». У такім стане вельмі ахвочы быў да спеваў. Кажу: «Добра, зараз паспяваем». А сама стараюся ўладкаваць на ложак (ён нападпітку хутка засынаў), потым сцягну чаравікі, накрыю. А назаўтра раненька ўстану, карову дагледжу, сняданак пастаўлю, словам не папракну. А ён і сам вінавата пазірае, усё разумее. Дык навошта ў сям'і разлад чыніць... А цяпер маладыя, як што не так, не толькі лаяцца і біцца, адразу ў суд бягуць разводзіцца. Ураз свабодныя, але ці шчаслівыя?».

Колькі гадоў прайшло, а нібы зараз чую вясёлы смех і не злую лаянку дзеда Тарасюка, майстра са Стойлаў Пружанскага раёна: «Ах ты сабача ката атрава! Негадзяй! — так ён часам ката прывячаў. І слова «негадзяй» у дзеда Мікалая мела шмат значэнняў: гэта і прамы сэнс — дрэнны, кепскі, чалавек і састарэлы хворы — негадзяшчы, і ласкава-паблажлівы, амаль «харошы мой». Ён і словы прыдумваў, і сюжэты да іх, і ўвасабляў сюжэты у сваіх драўляных вырабах. Шмат гадоў выразаў з дрэва фігуркі, як сам называў, драўляны люд, які зараз упрыгожвае музеі. І вельмі любіў сваю зямлю, бацькаўшчыну, і завяшчаў яе берагчы.

Яшчэ столькі, а то і больш, відаць, магла б зараз расказаць пра герояў сваёй рубрыкі «Вёскі, якія знікаюць: апошнія жыхары». Бо не раз здзіўлялася, спачувала, захаплялася і, галоўнае, палюбіла іх: прыгожых, моцных духам людзей з глыбінкі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# НА ВАХЦЕ ПАМЯЦІ

## Як «Звязда» вяртала з небыцця імёны герояў Вялікай Айчыннай вайны, адстойвала гонар партызанаў і ўвекавечвала подзвіг сваіх адважных папярэднікаў

**Наша газета — адно з нямногіх выданняў, якое выходзіла падчас нямецка-фашысцкай акупацыі. У захопленым Мінску — ва ўмовах, не прызначаных для выдавецкай дзейнасці, пад штодзённай пагрозай смерці, — убачылі свет чатыры нумары падпольнай «Звязды». Выдадзеныя 105 выпускаў у партызанскай зоне таксама даліся няпроста. За выхад падпольнай газеты была заплачана вельмі высокая цана — многія, хто меў да гэтага дачыненне, не прычакалі Перамогі...**

Інакш быць не магло — патрыёты, якія ведалі сілу журналісцкага слова і трапна карысталіся ім, не засталіся ў баку ў такі няпросты час. За вялікія заслугі ў мабілізацыі беларускага народа на барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у перыяд Вялікай Айчыннай вайны найстарэйшае рэспубліканскае выданне Беларусі было ўзнагароджана ордэнамі Айчыннай вайны І ступені і Працоўнага Чырвонага Сцяга. «Звязда» — адзіная газета Савецкага Саюза, якая мае баявую ўзнагароду... і такую колькасць помнікаў, якія паставіў ёй народ.

Аднак і ў мірны час «Звязда» вымушана была адстойваць гістарычную памяць, супрацьстаяць спробам фальсіфікацыі гераічнага мінулага, якія не спыняюцца да сёння. І ў гэтым заслуга добрасумленных журналістаў, сапраўдных патрыётаў сваёй Айчыны. Сярод іх — Таццяна Падаляк, якая на працягу 20-гадовай работы ў «Звяздзе» ажыццявіла нямала патрыятычных праектаў, што ўвайшлі ў гісторыю нашай газеты і ўвогуле краіны. Сваім багатым досведам вопытны журналіст, прафесар кафедры медыялогіі факультэта журналістыкі БДУ, доктар філалагічных навук, дацэнт цяпер дзеліцца з будучымі супрацоўнікамі масмедыя. Напярэдадні знакавай даты Таццяна Уладзіміраўна адказала на пытанні «Звязды», у якой прайшла шлях ад карэспандэнта да намесніка галоўнага рэдактара.

***— У пачатку 1990-х, калі ў Беларусі распачала нарастаць хваля фальсіфікацый адносна Вялікай Айчыннай вайны, газета «Звязда» адной з першых стала на абарону гістарычнай праўды...***

— Час быў няпросты: кардынальныя «пераасэнсаванні» гісторыі, звяржэнні герояў, навязванне «альтэрнатыўных» поглядаў на падзеі Вялікай Айчыннай... Ні разу наша «Звязда» — ні артыкулам, ні радком, ні словам — не здрадзіла сваім ваенным калегам-папярэднікам. Захаванне і адстойванне гістарычнай праўды заўсёды было ў цэнтры ўвагі найстарэйшай беларускай газеты. У пасляваенны рэдакцыі працавалі журналісты, якія выдавалі падпольную «Звязду», многія франтавікі, партызаны. Напрыклад, выдатны фельетаніст і нарысіст Янка Казлоў стаў журналістам «Звязды» адразу пасля вызвалення Беларусі, у 1944 годзе. Яму было ўсяго 25. Але на той час гэта ўжо быў сфарміраваны чалавек з няпростай ваеннай біяграфіяй. Ён быў байцом партызанскага атрада імя С. Будзённага з кастрычніка 1942 года. У 1943-м быў пераведзены ў абкам КП(б) Беларусі на пасаду радыста рэдакцыі Беластоцкай абласной падпольнай газеты «Белостокская правда». Іван Кандратавіч адпрацаваў у «Звяздзе» 40 гадоў. Мы даволі часта стэлефаноўваліся, ён да апошняга не губляў пачуцця гумару. На Дзень Перамогі «звяздоўцы» прыязджалі да яго з віншаваннямі і традыцыйна гучала Сіманаўскае: «Выпьем за Победу, за свою газету!..»

У пачатку 1990-х тэма Вялікай Айчыннай вайны нячаста асвятлялася ў прэсе альбо закраналася ў сувязі з разнастайнымі форумамі «беларусаў свету», якія ў той час модна было праводзіць. На іх з ахвотай з'язджаліся ў тым ліку многія калабаранты, што збеглі з Беларусі ў 1944-м разам з немцамі. Яны ехалі сюды ледзь не героямі.

***— Пра гэта цяпер мала хто ведае...***

— З песні слоў не выкінеш. Журналісты вымушаныя былі брацца у «гасцей» міні-інтэрв'ю. Дзве такія публікацыі ёсць і ў мяне. Падпісаныя псеўданімам. Самае любімае пытанне да «замежных беларусаў»: ці маркуеце наведаць Хатынь і музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны? На мяне глядзелі, як на ненармальную, і цынічна тлумачылі, што ў Беларусі іх цікавіць «культурніцкі аспект»... Менавіта тады падышла да галоўнага рэдактара Уладзіміра Наркевіча і папрасіла даверыць мне ваенную тэматыку. Першы артыкул называўся «У кожнага — свая жыццёвая праўда. Але ісціна, як і Радзіма, — адна. На ўсіх». Канкрэтныя факты на падставе эксклюзіўных дакументаў аналізаваліся вядомым гісторыкам, тагачаснай загадчыцай аддзела партызанскага руху Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Раісай Чарнаглазавай. На працягу доўгага часу яна была галоўным кансультантам «звяздоўскіх» публікацый на ваенную тэму, якія мелі шырокі рэзананс у грамадстве. Заўсёды з усмешкай згадваю: у рэдакцыю тэлефанавалі ветэраны з пытаннем, у якім партызанскім атрадзе ваявала — хоць нарадзілася я праз 20 гадоў пасля вайны. У нас, беларусаў, памяць яе, мабыць, у генах.

***— Нягледзячы на вялікую колькасць апанентаў, у пытанні захавання памяці аб падзеях Вялікай Айчыннай і іх героях у «Звязды» былі аўтарытэтныя прыхільнікі, якія на ўласным вопыце ведалі, што такое вайна: Іван Шамякін, Пімен Панчанка, Міхаіл Савіцкі... Нягледзячы на няпросты характар народнага мастака СССР, Героя Беларусі, вы з ім знайшлі агульную мову, аб чым сведчыць цыкл інтэрв'ю з Савіцкім. Як майстар ставіўся да перапісвання гісторыі?***

— Жорстка негатыўна. Цэнтральная тэма творчасці Міхаіла Андрэевіча — мастакоўскае зацверджанне праўды вайны. Праўды, якую немагчыма абвергнуць. Апошняя вялікая работа, над якой працаваў Міхаіл Савіцкі, — «Скобраўка-1944» — была задумана, каб адкрыць яшчэ адну страшную праўду Вялікай Айчыннай вайны на Беларусі, пра якую чамусьці доўгі час маўчалі. Канцлагер каля Мар'інай Горкі, у Скобраўцы, дзе забіралі кроў у дзяцей, нідзе афіцыйна не існаваў. Праз яго прайшло больш за тры тысячы дзетак. Гіганцкі лагер... Дзяцей, якія не вытрымлівалі, пасля трох забораў крыві памiралі — іх проста закопвалі... Савіцкі хацеў гучна сказаць аб гэтым найвялікшым злачынстве. Ён вельмі сур'ёзна ставіўся да той работы. Шмат разоў перарабляў. Замазваў... На жаль, так і не паспеў завяршыць. Работа захоўваецца ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага.

***— Па ініцыятыве народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна 16 чэрвеня 2005 года Мінгарвыканкам прыняў рашэнне аб устанаўленні ў Мінску праспекта газеты «Звязда». Як грамадскасць успрыняла дадзены факт і ці доўгай была «эпапея» ў гэтым выпадку ўстанаўлення гістарычнай справядлівасці?***

— І насамрэч, гістарычная справядлівасць. Сёння нямногія помняць, што дэпутатамі было прынята рашэнне перайменаваць праспект газеты «Известия» ў праспект газеты «Звязда». Зварот Івана Пятровіча Шамякіна быў апублікаваны 21 мая 2002 года. На працягу трох гадоў ішлі лісты ў падтрымку прапановы народнага пісьменніка — ад паэтаў і празаікаў, мастакоў, тэатральных дзеячаў, калег-журналістаў, чытачоў. У падтрымку выказаліся і тагачасныя міністры інфармацыі, культуры, адукацыі, кіраўнікі Нацыянальнай бібліятэкі, музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальнага тэатра імя Янкі Купалы, многія іншыя. Праспект газеты «Звязда» — вельмі ўтульны куточак нашай сталіцы!




Таццяна Падаляк з Іванам Шамякіным.

***— «Звязда» адкрывала імёны ўдзельнікаў вайны, якія былі незаслужана забытыя. У прыватнасці, было вернута з небыцця імя Трыфана Лук'яновіча. З чаго ўсё пачалося?***

— Мінчанін Трыфан Лук'яновіч — адзін з тых, хто афіцыйна «ў спісах не значыцца». З подзвігам гэтага беларуса звязваюць сюжэт сусветна вядомага мемарыяла ў берлінскім Трэптаў-парку: савецкі салдат ратуе нямецкае дзіця. (Удакладню: паводле гістарычных крыніц, пры штурме Берліна савецкія салдаты выратавалі больш за 200 нямецкіх дзяцей.) На вуліцы Эльзенштрасэ ў Берліне стаіць стэла, надпіс на якой паведамляе, што на гэтым месцы Трыфан Лук'яновіч, старшы сяржант Савецкай Арміі, 29 красавіка 1945 года цаной уласнага жыцця выратаваў нямецкае дзіця ад кулі эсэсаўцаў. Але ў Беларусі самога Лук'яновіча доўгі час лічылі легендай: не захавалася дакументаў — значыць, і не было такога чалавека.

Праз многія гады пасля вайны надзвычай цяжка ўстанавіць праўду і аднавіць справядлівасць. І ўсё ж рэдакцыя «Звязды» паспрабавала тое зрабіць, правёўшы своеасаблівае журналісцкае расследаванне з дапамогай франтавіка Георгія Сасноўскага, колішняга дырэктара музея баявой і працоўнай славы «БелВАР» — да вайны гэта быў радыёзавод імя Леніна, дзе працаваў Лук'яновіч. Дарэчы, на адным з будынкаў на праспекце Незалежнасці беларускай сталіцы можна ўбачыць створаны Заірам Азгурам барэльеф з выявай салдата з дзяўчынкай на руках і адпаведным надпісам пра Лук'яновіча. Не захавалася дакументаў Лук'яновіча, не засталося яго родных — усё і ўсіх знішчыла вайна. Георгій Сасноўскі пачаў шукаць сведкаў подзвігу нашага земляка і завадчан, якія ведалі яго да вайны. І знайшоў! Прааналізаваўшы сітуацыю, мы прыйшлі да высновы, што цалкам апраўданая для мірнага часу логіка «няма дакументаў — няма і чалавека» не можа быць прынята за абсалютны аргумент, калі гаворка ідзе пра вайну. Надта ўжо наварочала-наблытала вайна, шмат знішчыла і спаліла, безліч пытанняў пакінула для нас, нашчадкаў...

***— Менавіта «Звязда» ўнесла прапанову назваць адну з вуліц Мінска ў гонар Лук'яновіча — адзначыўшы, што гэта была б даніна павагі і памяці не толькі высакароднаму ўчынку нашага земляка, але і ўсім, хто не вярнуўся з вайны, хто прапаў без вестак на франтах Вялікай Айчыннай і чым родным ваенныя архівы дагэтуль выдаюць даведкі: «У спісах не значыцца...»***

— Ініцыятыву газеты падтрымалі шматлікія чытачы, ветэраны Вялікай Айчыннай, цэлыя працоўныя калектывы. Выйшла звыш дзясятка публікацый па ўзнятай праблеме. І вось пасля трохгадовай «эпапеі» легендарны беларус вярнуўся на радзіму: 15 кастрычніка 1997 года ў Мінску адбылося ўрачыстае перайменаванне 3-й Пасялковай вуліцы ў вуліцу Трыфана Лук'яновіча. Здавалася б, справядлівасць і здаровы сэнс узялі верх — і можна паставіць кропку. Але... Ужо ў пачатку XXI стагоддзя зноў сталі ўзнімаца пытанні наконт нашага земляка, толькі на гэты раз — у зусім іншым, малазразумелым кантэксце і з дзіўнымі акцэнтамі: легендарны подзвіг Лук'яновіча некаторыя асобы пачалі далучаць да ліку... фальсіфікацый Вялікай Айчыннай вайны. Вінавацілі і «Звязду», і журналіста. І зноў трэба было брацца за пяро. Згадала кінааператара і рэжысёра, народнага артыста Беларусі, франтавіка Іосіфа Вейнеровіча. Першую сваю Дзяржаўную прэмію (тады яна называлася Сталінская) Іосіф Навумавіч атрымаў яшчэ ў 1943 годзе. Чалавек, якога па праве называюць летапісцам народнага подзвігу. Падчас вайны ён здымаў франтавую і партызанскую хроніку, удзельнічаў у стварэнні фільмаў «Абарона Масквы», «Разгром фашысцкіх войскаў пад Масквой», «Народныя мсціўцы», «Вызваленне Савецкай Беларусі», многіх іншых. У дакументальны фільм «Пяць гадоў і ўсё жыццё» Вейнеровіч увёў невялікую кінанавелу пра Лук'яновіча — хоць, прызнаўся, многія чыноўнікі былі супраць: маўляў, дзе паперкі? Іосіф Навумавіч гаварыў: «Крыўдна! Ну як жа так, немцы, нашы колішнія ворагі, паставілі помнік, а мы ўсё адбіваемся: справа ў паперцы!.. Колькі разоў я скакаў у тыл ворага з парашутам, з кінаапаратурай — ні пра якія паперкі не думаў!..»

***— І ў каторы раз «Звяздзе» ўдалося адстаяць гістарычную праўду...***

— Гісторыкі, якія строга прытрымліваюцца выключна дакументальных крыніц, пагаджаюцца: сітуацыю вакол подзвіга Лук'яновіча ніяк нельга звязваць з фальсіфікацыямі Вялікай Айчыннай вайны. Якая ж гэта фальсіфікацыя? Гэта можа быць міф, легенда... Што ж, можна падысці да праблемы і з такога боку: а калі Лук'яновіч — і сапраўды легенда? Дык любая легенда заўсёды грунтуецца на канкрэтнай падзеі. Штосьці можа быць дададзена, нешта прыхарошана, але ў аснове ўсё роўна — рэальны факт. Калі пра беларуса ходзяць легенды, дык варта ганарыцца! І ўсё ж будзем сумленна глядзець праўдзе ў вочы. Колькі безыменных брацкіх магіл, дзе спяць вечным сном невядомыя салдаты, раскідана і на беларускай зямлі, і ў іншых краінах «паў-Еўропы», якую яны «прошагали-проползли» за Перамогу. Як ні прыкра, але ж і дагэтуль непахаванымі застаюцца дзясяткі тысяч нашых салдат, салдат-пераможцаў. Якія звесткі захавалі пра іх ваенныя архівы? І якія адказы даюцца іх родным на запыты? Мабыць, такі ж, як і на запыт пра Трыфана Лук'яновіча: «У спісах не значыцца...»

Нацыя, дзяржава, народ моцныя, калі ўмеюць шанаваць і помніць сваіх герояў —

тых, каму абавязаныя жыццём, самім фактам існавання. На вуліцы Трыфана Лук'яновіча ў Мінску народжаныя ўжо ў XXI стагоддзі маленькія грамадзяне Беларусі вучацца рабіць свае першыя крокі, бацькі расказваюць сваім дзецям пра вайну і пра Перамогу, пра мужнага сына нашай зямлі, які ў апошнія дні вайны цаной уласнага жыцця выратаваў нямецкую дзяўчынку. Жыццё працягваецца — памяць жыве.

***— Адной з першых пасля доўгага перапынку газета ўзняла тэму спаленых разам з жыхарамі вёсак у гады Другой сусветнай вайны. Аб трагедыях сваіх населеных пунктаў праз «Звязду» расказвалі яшчэ жывыя сведкі тых падзей, якім цудам пашчасціла пазбегнуць фашысцкай расправы. За цыкл публікацый «Нашчадкі вогненных вёсак» вы атрымалі Спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва ў галіне журналістыкі. Прайшло больш за дзесяць гадоў, а тэма па-ранейшаму актуальная — з'яўляюцца новыя помнікі спаленым фашыстамі вёскам, у межах Усебеларускай маладзёжнай будоўлі ідзе рэканструкцыя Хатыні...***

— Тэма яшчэ больш актуалізавалася — фальсіфікацыі гісторыі вайны становяцца ўсё больш цынічнымі і бессаромнымі. Нарастае хваля спроб перагледзець вынікі Другой сусветнай вайны з мэтай прынізіць ролю СССР і народаў нашай тады агульнай вялікай краіны ў Перамозе над гітлераўскай Германіяй. Прычым аб укладзе Беларусі і панесеных ахвярах многія «спецыялісты» ўвогуле імкнуцца не згадваць. Патрыятычная ініцыятыва «Нашчадкі вогненных вёсак» не была выпадковай. Каб паставіць заслону хлусні, якая захутваецца ў адзенне праўдападобнасці, рэдакцыя «Звязды» і ДМК «Хатынь» у пачатку 2006 года звярнуліся да сведкаў трагедый спаленых вёсак з просьбай-прапановай адгукнуцца. Зварот атрымаў шырокі рэзананс. У пачатку XXI стагоддзя засталіся сапраўды апошнія сведкі. У вайну яны былі дзецьмі, падлеткамі. Надзвычай важна было пачуць іх галасы. Каб помніць. Каб падобныя трагедыі не паўтараліся ніколі і нідзе. Публікуючы матэрыялы праекта «Нашчадкі вогненных вёсак», найстарэйшая беларуская газета яшчэ раз пацвердзіла: на тэрыторыі Беларусі нямецка-фашысцкія акупанты вялі вайну на знішчэнне. Тактыка «выпаленай зямлі», «пашырэння жыццёвай прасторы» — нацысцкі генеральны план «Ост». Тры чвэрці насельніцтва падлягала «высяленню» з роднай зямлі — фізічнаму знішчэнню. Чвэрць — «анямечванню», ператварэнню ў рабоў. Мінулая вайна і страты ў ёй — балючая, незагойная рана беларускага народа.

***— 24 верасня 1980 года на галоўнай плошчы Мінска быў адкрыты помнік першаму рэдактару падпольнай «Звязды» Уладзіміру Амельянюку і яго баявым таварышам. Вы, яшчэ школьніцай, былі ў складзе ганаровай вахты. Напэўна, лёс?***

— Пра гэты факт зусім забыла. Успомніўся ён выпадкова — калі гісторык Яўген Бараноўскі прынёс вялікі артыкул пра тое, як вызначалася месца гібелі Амельянюка і ўстанаўліваўся помнік. Матэрыял суправаджаўся фотаздымкамі з адкрыцця помніка, у тым ліку апублікаванымі «Звяздой» рэпартаж з гэтай падзеі. У газеце раптам пазнала сябе. Дык вось жа я, перадапошняя ў шэрагу ганаровай вахты. Столькі часу прайшло з верасня 1980-га, але хіба можа забыць, як тое было. Як адбываўся конкурс сярод вучняў мінскіх школ на права быць у складзе ганаровай вахты ў час адкрыцця помніка. Акрамя традыцыйнага набору характарыстык (выдатніца, камсамолка, актывістка), у мяне былі і творчыя дасягненні, шматлікія публікацыі ў газеце «Чырвоная змена»...

Як дзіўна складваецца жыццё. Ці мо сапраўды ёсць нейкае наканаванне лёсу, і мая ганаровая вахта на адкрыцці помніка Уладзіміру Амельянюку і загінулым журналістам-падпольшчыкам была зусім не выпадковай? Пазней я стала журналісткай «Звязды», дзе амаль незаўважна праляцелі натхнёныя 20 гадоў. Магчыма, сваю першую, самую галоўную журналісцкую загартоўку я атрымала менавіта тады, у верасні 1980-га, калі школьніцай мела гонар далучыцца да гісторыі газеты-патрыёткі. І гэтая ганаровая вахта памяці для мяне — назаўсёды.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота з архіва Таццяны ПАДАЛЯК.**

# Па слядах зніклых нумароў

## Карэспандэнт «Звязды» паспрабавала запоўніць белыя плямы ў ваеннай гісторыі газеты

**Самы загадкавы момант у гісторыі «Звязды» звязаны менавіта з вайной. Дагэтуль гісторыкі спрачаюцца, паспеў выйсці хоць бы адзін з нумароў у пачатку вайны ў Магілёве ці не.**

У Магілёўскай абласной бібліятэцы імя У. Леніна газеты таго перыяду не захавалася. Самыя раннія тут датаваныя 1945 годам. Але ёсць крыніцы, якія ўскосна сведчаць, што ў Магілёве магло быць выдадзена як мінімум тры нумары «Звязды». **Дырэктар бібліятэкі Ілона САРОКІНА** спасылаецца на літаратуру, якая захоўваецца ў фондах. У кнізе «Наша «Звязда», што была выдадзена да 50-годдзя газеты, ёсць інфармацыя, паводле якой па ўказанні Цэнтральнага камітэта Кампартыі Беларусі рэспубліканскія рэдакцыі выехалі з Мінска і працягвалі выпускаць газеты ў раённай рэдакцыі, потым — Магілёўскай абласной друкарні. Пасля Магілёва «Звязда» пэўны час выпускалася на гомельскай фабрыцы «Палесдрук». Там жа гаворыцца пра тое, што «з пачатку вайны «Звязда» выходзіла 23, 26, 29 і 30 чэрвеня». І пра тое, што «за 19 дзён ліпеня выйшла 14 нумароў, і толькі з 20 ліпеня «Звязда» пачала выходзіць рэгулярна, штодзённа».

Што газета магла выдавацца ў магілёўскай друкарні, сведчыць і нарыс С. Марцэлава «Друк Савецкай Беларусі». Там гаворыцца, што 27 чэрвеня 1941 года ЦК КПБ прыняў пастанову аб аднаўленні выдання газет «Звязда» ў Магілёве і «Советская Белоруссия» ў Гомелі.

Пра факт выхаду газеты ў акрэслены перыяд у магілёўскай тыпаграфіі гаворыцца і ў чацвёртым томе Беларускай савецкай энцыклапедыі за 1971 год. «У пачатку вайны «Звязда» выходзіла ў Мінску, потым — Магілёве і Гомелі да 13.08.1941 уключна».

— Усё вельмі супярэчліва, — кажа кіраўнік бібліятэкі. — Калі ў старых кнігах і энцыклапедыях напісана, што яна стваралася і ў Магілёве, то больш новыя гэта адмаўляюць. У выданні, прысвечаным 100-годдзю «Звязды», гаворыцца, што газета «не паспела выйсці ў Магілёве з-за імклівага наступлення нямецкіх войскаў і пагрозы захопу Магілёва, вымушана была пераехаць у Гомель. Там у друкарні «Палесдрук» яна і друкавалася да 13 жніўня 1941 года».

Магілёўскі фотамайстар і краязнавец Ірына Савосіна прытрымліваецца версіі, што ў ваенным хаосе факт выдання газеты ў Магілёве мог проста страціцца. У тыя трывожныя дні ў горадзе на Дняпры перасякаліся шляхі не толькі розных вядомых і малавядомых палітычных і ваенных дзеячаў, але і розных выданняў, каштоўных грузаў. Яна аналізавала першыя дні вайны ў Магілёве па кнізе Канстанціна Сіманава «Розныя дні вайны». Аўтар «Жывых і мёртвых», які апісаў у гэтай трылогіі гераічную абарону Магілёва, якраз знаходзіўся ў той час на Магілёўшчыне.




**У першыя дні вайны газеты выдаваліся ў былым будынку губернскага праўлення.**

— У сваіх успамінах ён расказвае, што дабраўся да Магілёва раніцай 28 чэрвеня 1941 года, — расказвае Ірына. — І свае першыя нататкі здаў у нумар франтавой газеты, якая друкавалася ў горадзе. Тэарэтычна ў гэты час там магла друкавацца і «Звязда». На жаль, дакладнай інфармацыі пра гэта няма. Але іншыя газеты выходзілі, прычым вельмі вялікімі тыражамі. Сіманаў піша, што франтавая выдавалася тыражом аж 40 тысяч экзэмпляраў і развозілася на 2-3 грузавіках. Ён і сам падахвоціўся ехаць пад Бабруйск з газетамі, якія патрэбна было развезці ва ўсе вайсковыя часці. У адным месцы пры дарозе стаяў атрад НКУС. І Сіманаў з калегамі раздаваў газеты, якіх у кузаве было 10 тысяч экзэмпляраў.

Ірына Савосіна разважае пра тое, што ў апошнія чэрвеньскія дні 1941-га Магілёў стаў месцам накшталт Бермудскага трохвугольніка. Тут апошні раз бачылі крыж Еўфрасінні Полацкай, але куды ён знік, дагэтуль невядома. Так і з газетай. Выходзіла яна тут ці не, невядома. Пацвердзіць або абвергнуць гэта цяпер немагчыма. Тыя нумары, калі і былі, на жаль, не захаваліся. Як, дарэчы, і сама друкарня. Яна раней знаходзілася на плошчы, якая сёння называецца плошчай Славы, у доме былой губернскай управы. Гэты будынак быў часткова разбураны падчас вайны, а потым і цалкам знесены. У пасляваенны час газеты друкаваліся ў падвальных памяшканнях Дома Саветаў, а ў 1970-я гады друкарня пераехала ў спецыяльна адбудаваны для яе трохпавярховік па вуліцы Першамайскай.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ШКОЛА «ЗВЯЗДЫ»,

## альбо Змена эпох — праз змену пакаленняў

**У кожнага свая «Звязда». Адна яна для тых, хто чытае, крыху іншая — для тых, хто піша. І ёсць яшчэ адзін вобраз гэтай рэдакцыі: у тых, хто толькі ўваходзіць у журналістыку. У розныя часы гэты прыход, відаць, адбываўся па-рознаму...**

— Ну, ты яшчэ маладая, не разумееш, — адказаў намеснік рэдактара «Звязды», калі я запытала, чаму мой тэкст, здадзены ў «Звязду», быў скарочаны амаль на палову. — Нічога, пройдзеш школу «Звязды», навучышся цаніць словы...

Я толькі прыйшла працаваць, скончыўшы журфак у 1992 годзе. Нас тады ў аддзеле інфармацыі было шасцёра — усе аднаго пакалення, альбо толькі скончылі, альбо вучыліся на апошніх курсах. Мы трымаліся купкай, бо былі «маладзёжнай фракцыяй» у рэдакцыі вельмі шаноўных супрацоўнікаў. Што ні імя — тое, лічы, класіка журналістыкі. Яны ведалі, як трэба пісаць (цяпер я разумею, што так і было!), і не стрымліваліся сябе ў ацэнках на рэдакцыйных лятучках, дзе разбіраліся нашы тэксты па драбніцах. Даходзіла да вельмі гарачых спрэчак, бо нам, акрамя заметак, хацелася пісаць матэрыялы на нейкія вострыя тэмы, шукаць адметных суразмоўцаў, нават самавыяўляцца — каб так не рабіў больш ніхто. «А ніхто і не робіць, бо так не варта», — гучаў жалезны аргумент ад фракцыі традыцыяналістаў. Кропку звычайна ставіў рэдактар Уладзімір Браніслававіч Наркевіч, які казаў вельмі проста: «Калі ласка, зрабіце лепш...» На гэтым спрэчкі сціхалі. Нашым моцным бокам былі актыўнасць і імпэт, з чым заўсёды асацыіруецца маладосць.

Змена пакаленняў у рэдакцыі газеты, якая ад фармату партыйнай у той час пераходзіла ў статус агульнанацыянальнага выдання, — складаны працэс. І нейкі час пайшоў на тое, каб сталыя супрацоўнікі прывыклі да думкі: маладая энергія вельмі важная ў журналістыцы, якая станавілася больш імклівай. Дапамагло і ўнутрырэдакцыйнае жыццё — тое, што дазваляла адчуваць сябе ў рэдакцыі сярод сваіх. Гэта была больш, чым работа, бо часам дадому людзі сыходзілі толькі на ноч, каб паспаць, — і з раніцы зноў у рэдакцыю. Як сям'я, дзе ўсе так ці інакш павінны чуць і паважаць адзін аднаго. Асабліва тое адчувалася, калі «Звязда» адзначала святы. Значна пазней у жыццё ўвайшлі карпаратывы (але гэта зусім не тое!), а тады віншаванне мужчынам на 23 лютага альбо жанчынам на 8 Сакавіка, ці напярэдадні Новага года, рабілі ў абедзенны перапынак, калі ўзнікала паўза паміж вёрсткай палос нумара, і ў рэжыме, падобным на тэатральны капуснік — з віктарынамі і конкурсамі, якія дазвалялі крыху пасмяяцца і паіншаму паглядзець адзін на аднаго. Нейкія імгненні — трапныя адказы, жарты, усмешкі — ператваралі нашых «бугроў», да якіх страшна было нават звярнуцца, у звычайных людзей, вясёлых і знаходлівых. І, аказвалася, побач з намі, такімі дзёрзкімі, насамрэч вельмі добрыя і харошыя людзі! Агульнарэдакцыйныя вандроўкі па гістарычных мясцінах звычайна ладзіліся да дзён нараджэння «Звязды» (у выхадныя мы разам спасцігалі Беларусь, яе старажытныя гарады, напрыклад Полацк, Нясвіж, Мір, калі яны яшчэ не былі агульнанацыянальнымі помнікамі, і проста выязджалі ў лес у грыбы). У такіх вандроўках сама дарога спрыяла раскрыццю звяздоўскіх талентаў. І аказвалася, што Іван Бараноўскі, які піша пра эканоміку, цудоўна спявае — дзіўна, што лёс прывёў яго не ў оперны тэатр. А фотакарэспандэнт Яўген Пясецкі піша вершы. А Людміла Рыжанкова, адказны сакратар, выдатная гаспадыня, якая ўсіх частуе грыбочкамі ўласнай кансервацыі...

Шмат каго з той рэдакцыі 1990-х гадоў ужо няма на свеце. Але тое, што гэтыя людзі былі — з душэўным святлом, з прынцыповым падыходам да работы, — самая вялікая мая навука ў журналістыцы. Бо можна прафесійна — і пры гэтым па-чалавечы, часам нават па-сямейнаму. Чалавек — не «колца і вінцік», а асоба, журналіст — не перакazчык, а голас грамадства. За кожным словам — жывы чалавек (вось чаму іх асабліва трэба цаніць!) Кожны чалавек — частка краіны, якую мы можам зрабіць лепшай. У гэтым і ёсць галоўная традыцыя «Звязды», якую я добра засвоіла з тых часоў, калі многае стала магчыма. Традыцыя жыве, як і працягвае працаваць школа «Звязды» — не толькі ў літаральным сэнсе (бо змена пакаленняў адбываецца перыядычна), але і ў чалавечым.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | **ИП Денекина Жанна Владимировна, УНП 791039825, 213808, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Гагарина, д. 59, кв. 44.** |
| **Продавец** | **ИП Дзыгун Т.И., УНП 790280302, 213800, Могилёвская обл., Бобруйский р-н, г. Бобруйск, ул. Урицкого, д. 137, кв. 121.** |

**Публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 157Б21190 в экономическом суде Могилевской области**

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| Лот № | Наименование | Начальная цена, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | 1/2 доля в имущественном праве на капитальное строение с инвентарным номером 710/С-37181 (назначение – здание жилое, наименование – жилой дом 36), общей площадью 27,5 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 720883601101000112 площадью 0,1524 га, расположенное по адресу: Могилевская обл., Бобруйский р-н, Слободковский с/с, д. Каменка, ул. Армейская, д. 36 | 1 800,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60POIS30130010484601933001 в ОАО «Паритетбанк», код банка POISBY2X, УНП 790280302, получатель платежа **– Индивидуальный предприниматель Дзыгун Татьяна Иосифовна**

**Шаг аукциона** – 5 % от начальной цены лота.

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте аукциониста ООО «Индустрия Инноваций» www.iin.by. Подробная информация об имуществе размешена на интернет-сайте https://bankrot.gov.by

**Срок подписания и заключения договора купли-продажи: 5 (пять)** рабочих дней после проведения публичных торгов (аукциона).

**Условия оплаты предмета торгов (аукциона): 30 календарных дней** со дня проведения торгов.

**Торги проводятся в соответствии с регламентом аукциониста ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресу:** www.iin.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить аукционисту торгов вознаграждение **4,5 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона).

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона).

**Дата и время проведения торгов (аукциона):**
начало торгов 11.00 08.09.2022 г.
по адресу: г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 3Н.

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются по 07.09.2022 г. до 16.00 по адресу: г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 3Н.** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ

**Государственное производственное объединение «Минскстрой» доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений и дополнений в проектную декларацию о строительстве жилых помещений в составе объекта строительства «Многоквартирные жилые дома в микрорайоне Чижовка-6 в границах улиц Уборевича–Чижевских–Корзюки». Жилой дом № 11 по генплану,**
опубликованную в газете «Звязда» от 01.07.2022 №127 (29749)

**Сведения об этапах строительства и сроках его реализации:**

Срок начала строительства объекта – 17 июня 2022 года.

Нормативная продолжительность строительства объекта 8,0 месяцев.

Планируемый срок завершения застройщиком строительства объекта и ввода в эксплуатацию в соответствии с проектной документацией – 16 февраля 2023 года.

**Количество объектов долевого строительства, предлагаемых для заключения договоров:**

В соответствии с решением Мингорисполкома от 28.07.2022 № 2476 «Об организации строительства объекта» договоры создания объектов долевого строительства будут заключаться на 25 квартир с сотрудниками государственных СМИ, в том числе Национального представительства МТРК «Мир» в Республике Беларусь, а также государственного учреждения «Национальный пресс-центр Республики Беларусь», состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий по месту работы, за счет собственных средств граждан.

**Цены на объекты долевого строительства:**

Стоимость строительства 1 квадратного метра общей площади объектов долевого строительства с выполнением внутренних отделочных работ в текущих ценах для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, составляет:

1 727,23 рублей (для нормируемой площади жилого помещения);

2 500,00 рублей (для площади жилого помещения, превышающей нормируемую).

**Условия ознакомления с объектами долевого строительства и ходом работ по ним:** ознакомиться можно в офисе застройщика ГПО «Минскстрой».

Заявления о заключении договоров будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней после опубликования настоящего извещения непосредственно от граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий по месту работы при наличии соответствующего направления, справки о состоянии на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий **(со сверкой учетных данных)** и паспорта гражданина, с которым будет заключаться договор. Договоры создания объектов долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящего извещения по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а, каб. 105 с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

УНП 100071325

**Могилевский филиал**
## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
**информирует о проведении 06.09.2022 открытого аукциона**
**Лот № 1:**
### Право заключения договора аренды капитального строения с инв. № 723/С-6902 – магазин «Книги»,
расположенного по адресу: Могилевская обл., Мстиславский р-н, г. Мстиславль, ул. Калинина, д. 29, общей площадью 83 кв. м.

Назначение: здание специализированное розничной торговли.
Срок заключения договора аренды – 1 (один) год.
Здание имеет статус историко-культурной ценности.
***Начальная цена – арендная плата в месяц за объект: 70 б.а.в (1 183,00 бел. рублей). Сумма задатка: 448,00 бел. руб.***
**Аукцион состоится 06 сентября 2022 года в 12.00**
по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.
Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона ino.by.
**Организатор аукциона:**
Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 351, 352,
**+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by**

**Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 09 сентября 2022 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже объекта недвижимости – здания магазина, принадлежащего Гомельскому областному потребительскому обществу на праве собственности**

**Лот № 1: здание магазина, инв. № 334/С-12150.** Адрес объекта: Гомельская обл., Лельчицкий р-н, г. п. Лельчицы, ул. Ленина, 48А. Назначение: здание специализированное розничной торговли. Одноэтажное здание, 1993 года постройки. Общая площадь 220,3 кв. м

**Начальная цена лота: 89 160,00 рублей** (в т. ч. НДС по ставке 20 %). **Задаток: 7 160,00 рублей** (в т. ч. НДС по ставке 20 %)

**Земельный участок** для обслуживания здания магазина на праве постоянного пользования площадью 0,2370 га. с кадастровым номером 322855100002002436. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

